Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 СНЕЖНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 235 (28093) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Шурык — хлопец самастойны**

СТАР. 4



**Цяжкі выбар: сваякі або карова**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# ГАСПАДЫНЯ СВЯТА

**Навагодняя ёлка на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску да свята гатовая. Спецыялісты ўжо сабралі металічны каркас, на які надзета больш за 3 тысячы пухнатых лапак. Вышыня галоўнага навагодняга сімвала — больш як 30 метраў, таму для ўстаноўкі выкарыстоўваецца спецтэхніка.**



Фота Надзеі БУЖАН.




## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый ВАКУЛЬЧЫК, старшыня КДБ:**

*«Сучаснае грамадства з'яўляецца аб'ектам бесперапыннага інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння. Пастаянна ўдасканальваюцца формы і метады маніпуліравання грамадскай думкай, лабіравання карыслівых інтарэсаў, а таксама правакавання крызісаў. Сітуацыя ў свеце, калі здзяйсняюцца каляровыя рэвалюцыі і ўзрастае тэрарыстычная пагроза, патрабуе павышанай увагі да такога важнага аспекту нацыянальнай бяспекі, як сацыяльна-псіхалагічны. Навуковая супольнасць у цеснай каардынацыі з практыкамі абавязана пастаянна шукаць адэкватныя адказы на падобныя выклікі і пагрозы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18184,00 | ▲ |
| Еўра | 19244,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 268,20 | ▼ |
| Укр. грыўня | 783,79 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

## ЦЁПЛА, АЛЕ ВЕТРАНА

**Пад уплывам атлантычных цыклонаў, якія перамяшчаюцца далёка на поўнач Еўропы, напрыканцы тыдня будзе надзейна перакрыта дарога арктычнаму холаду на тэрыторыю нашай краіны. Таму ў гэтыя выхадныя дні чакаецца ветранае і вельмі цёплае для гэтага часу надвор'е, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра. Ападкаў будзе няшмат, у асноўным дождж.**

Сёння ўдзень на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць малаактыўныя атмасферныя франты і вільготная паветраная маса атлантычнага паходжання. Месцамі пройдуць невялікія ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу. У асобных раёнах чакаецца туман. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Будзе даволі ветрана (да 15-18 м/с), а максімальная тэмпература паветра складзе плюс 2-7 градусаў.

У суботу ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер заходні, паўднёва-заходні парывісты, у асобных раёнах парывамі да 15-18 м/с. Уначы не прагназуецца нават замаразкаў: тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, а ўдзень будзе 2-8 цяпла. Яшчэ мацней пачнуць фарміраваць надвор'е ў нас цёплыя паветраныя масы з Атлантыкі ў нядзелю. Тады кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі месцамі на поўначы краіны. Удзень на большай частцы тэрыторыі чакаецца ўзмацненне паўднёва-заходняга ветру з парывамі да 15-20 м/с. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, а максімальная ўдзень — ад 4 да 10 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня ўплыў цёплых паветраных мас атлантычнага паходжання захаваецца. У панядзелак месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Амаль паўсюдна будзе гаспадарыць моцны парывісты вецер. Стане яшчэ цяплей, калі ўначы тэмпература паветра складзе плюс 2-7 градусаў, а ўдзень чакаецца ўвогуле ад 5 да 10 цяпла. Няўжо ў лесе з'явяцца і снежаньскія грыбы?..

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Будзь у курсе!

## 31 снежня — па графіку пятніцы

**Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» праінфармавала пасажыраў аб працы прыгарадных маршрутаў з канца снежня да сярэдзіны студзеня ў сувязі з пераносам рабочых дзён згодна з пастановай Савета Міністраў.**

Так, 24 і 31 снежня аўтобусы будуць хадзіць у прыгарад і назад па графіку пятніцы. 25 і 26 снежня пасажырам пры планаванні паездак трэба будзе арыентавацца на графік суботы. 27 нежня прыгарадныя маршруты будуць працаваць па графіку нядзелі.

Па графіку нядзелі аўтобусы будуць курсіраваць і ў пачатку наступнага месяца: 1, 3, а таксама 10 і 17 студзеня. Суботні расклад уводзіцца на 2 і 7-9 студзеня. 6 і 16 студзеня прыгарадныя аўтобусныя маршруты працуюць па графіку пятніцы. 15 студзеня дабрацца да прыгарадных населеных пунктаў можна будзе па раскладзе чацвярга.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# РАСПІСАЦЬ ПА ПУНКТАХ

**Кіраўніцтву ААТ «Камволь» неабходна падрыхтаваць абгрунтаванне выдзялення дадатковых сродкаў на рэалізацыю інвестыцыйнага праекта на прадпрыемстве.**

Такое даручэнне даў **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** падчас наведвання прадпрыемства. Тут на нарадзе, сярод іншых пытанняў, быў разгледжаны ход выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па пытаннях мадэрнізацыі і развіцця прадпрыемства, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА. «Падрыхтуйце мне абгрунтаванне выдзялення дадатковых сродкаў, дзе будзе распісана па пунктах, на што пойдуць гэтыя грошы», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў, калі кіраўніцтва прадпрыемства далажыла, што для завяршэння інвестыцыйнага праекта неабходны дадатковыя сродкі з інавацыйнага фонду Мінгарвыканкама.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што на «Камволі» ўжо праведзена сур'ёзная мадэрнізацыя, забяспечана магчымасць вытворчасці 6 мільёнаў пагонных метраў тканін у год. «Выканана, на жаль, не ўсё, фінішная аперацыя, звязаная з аздабленнем тканін, патрабуе заканчэння мадэрнізацыі. Хутчэй за ўсё, гэта адбудзецца ў першай палове 2016-га — не пазней», — падкрэсліў ён.

Ёсць праблемы і ў частцы рэалізацыі прадукцыі. «Мы спачатку трацім грошы, а потым пачынаем актыўна шукаць спажыўцоў прадукцыі, хоць відавочна, што пытанні рэалізацыі тавару — ключавыя. Сапраўды, зроблена вялікая работа тэхналагічных службаў па падрыхтоўцы цалкам новага якаснага асартыменту, які павінен быць запатрабаваны, у першую чаргу, нашымі нацыянальнымі швейнікамі. Але пакуль тут не ўсё спрацоўвае. Таму, перш чым прымаць канчатковае рашэнне і па фінансавых пытаннях, і па пытаннях завяршэння рэканструкцыі, мы павінны сур'ёзна прыбавіць менавіта ў гэтай частцы», — канстатаваў прэм'ер-міністр.

# ШКОЛА ЛІДАРСТВА І ДРУЖБЫ

**Студатрадаўскі рух — добрая школа дружбы і лідарства. Такое меркаванне выказала намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА, якая прыняла ўдзел ва ўрачыстай цырымоніі закрыцця трэцяга працоўнага семестра 2015 года.**

«На мой погляд, работа студэнцкіх атрадаў — гэта добрая школа дружбы, зносін. Байцы, якія бяруць удзел у студатрадаўскім руху, — гэта сапраўды лідары, якія не проста глядзяць з боку на развіццё сваёй краіны, а бяруць актыўны ўдзел у гэтым», — сказала Наталля Качанава. Па словах віцэ-прэм'ера, многія кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый у свой час таксама былі байцамі студатрадаў.

Наталля Качанава станоўча ацаніла той факт, што сёння хлопцы і дзяўчаты могуць працаваць у студэнцкіх атрадах не толькі летам, але і на працягу года ў вольны ад вучобы час. Гаворачы аб укладзе, які ўнесла моладзь у развіццё краіны, віцэ-прэм'ер адзначыла многія знакавыя аб'екты, пабудаваныя рукамі маладых людзей. Да прыкладу, у гэтым годзе больш за 500 байцоў студэнцкіх атрадаў прымалі актыўны ўдзел у будаўніцтве беларускай атамнай станцыі. Паводле яе слоў, гэта дарагога варта, таму што часцінка іх працы навекі застанецца ў гэтай важнай справе.

«Беларусь стала першай краінай, якая падтрымала студэнцкія атрады заканадаўча. Гэта вельмі важна», — звярнула ўвагу намеснік прэм'ер-міністра. Яна таксама адзначыла, што ў беларускага студатрадаўскага руху — цудоўныя традыцыі, якія былі закладзены старэйшымі пакаленнямі. «Сёння тое, што працягвае наша моладзь пры падтрымцы дзяржавы, вядома, гэта выдатна», — сказала яна.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

9 снежня 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполнения налогового обязательства**

**ЛОТ №1: Капитальное строение с инв. № 700/С-48682 – Здание цеха №2**, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 140: общ. пл. 7937 кв.м, год постройки здания – 1968 г., фундамент – ж/бетонный, стены – панельные, кирпичные, перекрытия – ж/б, кровля – рулонная. Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000003005473 площадью 7,9373 га.

**Начальная цена продажи – 3 940 789 000 рублей.**
**Сумма задатка – 394 078 900 рублей**

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 15 января 2016 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Лазаренко, 29** офис МОУ Филиала «Центр «Белтехинвентаризация». Последний день подачи заявок и внесения задатка: **14 января 2016 года до 15.00** |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение двух месяцев и двадцати дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона разовым платежом либо траншами |

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Информацию о порядке регистрации и участия в аукционе можно получить у организатора аукциона: **(8-0222) 25-03-37, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25, эл. почта bti9@inbox.ru**


## Парламенцкі дзённік

# ПЕРШАЕ ЧЫТАННЕ... «БІБЛІІ»

## У Палаце прадстаўнікоў разгледзелі праект Кодэкса аб культуры

**Дакумент дэпутатам прадстаўляла першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына ДРЫГА. Яна назвала гэты дакумент першым у свеце і свайго роду «бібліяй галіны культуры», якая дазваляе аб'яднаць дзейную заканадаўчую базу і значна скараціць колькасць нарматыўных прававых актаў і адсылачных нормаў.**

Тым не менш праект Кодэкса аб культуры атрымаўся досыць аб'ёмным: ён уключае ў сябе каля 60 нарматыўна-прававых актаў, складаецца з агульнай і спецыяльнай частак, змяшчае 5 раздзелаў, 27 глаў і 257 артыкулаў.

У першай частцы прапісаны асноўныя мэты і напрамкі дзяржаўнай палітыкі, прынцыпы грамадскіх адносін у сферы культуры, прававыя асновы міжнароднага супрацоўніцтва і пералік суб'ектаў культурнай дзейнасці. Да апошніх, акрамя творчых асоб, калектываў мастацкай творчасці, творчых саюзаў, аднесены ўстановы адукацыі, навуковыя арганізацыі і іншыя юрыдычныя асобы рознай формы ўласнасці, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць.

Як асобныя суб'екты культурнай дзейнасці упершыню ў Беларусі заканадаўча замацаваны спонсары культуры і мецэнаты. Асобная норма прадугледжвае ўзаемадзеянне ў сферы культуры дзяржаўных органаў з грамадскімі аб'яднаннямі, камерцыйнымі арганізацыямі і прадпрымальнікамі. Праект кодэкса пашырае ролю грамадскіх аб'яднанняў па ахове помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. У дакуменце прадугледжваецца падтрымка беларусаў замежжа ў сферы культуры. Творчым саюзам даецца права пацвярджаць статус творчага работніка незалежна ад членства. Праект кодэкса таксама дае магчымасць творчым саюзам ствараць фільмы і тэлепраграмы, праводзіць навучальныя курсы без стварэння камерцыйнай арганізацыі, што дазволіць ім атрымліваць дадатковае фінансаванне.

— З улікам канстытуцыйных нормаў творчая дзейнасць не абмяжоўваецца з боку дзяржавы, за выключэннем той, што прапагандуе вайну, гвалт, жорсткасць, экстрэмізм, парнаграфію, — падкрэсліла намеснік міністра культуры.

Упершыню на заканадаўчым узроўні замацоўваюцца пытанні аховы археалагічнай спадчыны. У прыватнасці, археалагічныя даследаванні, згодна з праектам, змогуць ажыццяўляць толькі тыя, хто мае адпаведны дазвол Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Усе археалагічныя артэфакты, знойдзеныя як падчас раскопак, так і выпадкова, законапраект абавязвае перадаваць у дзяржаўную ўласнасць і забараняе грамадзянам іх абарачэнне.

Народным рамеснікам дазваляецца творчае вар'іраванне ўзораў і выкарыстанне механізаванай працы пры дапаможных аперацыях.

У праекце кодэкса прапісваецца новае правіла наведвання дыскатэк: забараняецца мець пры гэтым зброю, выбухованебяспечныя рэчывы, знаходзіцца ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення, пад уздзеяннем адурманьваючых рэчываў. Таксама рэгламентавана, што грамадзяне, якія не дасягнулі 16 гадоў, не могуць знаходзіцца на начной дыскатэцы без суправаджэння бацькоў, апекуноў або іншых дарослых.

— Кодэкс упершыню будзе з'яўляцца адзіным заканадаўчым актам, які дазволіць пераадолець недахопы і вывесці прававое рэгуляванне грамадскіх адносін у сферы культуры на прынцыпова новы ўзровень, — запэўніла парламентарыяў Ірына Дрыга. — Мы спадзяёмся, што з прыняццем кодэкса завершыцца працэс фарміравання заканадаўства аб культуры ў поўнай, лагічнай і паслядоўнай сістэме.

Пытанняў па праекце кодэкса аб культуры ад дэпутатаў было шмат. Яны тычыліся і статусу «нацыянальнага фільма», і звання «дзеяч культуры», і ўмоў вяртання грошай за нявыкарыстаныя білеты, і «чорных капальнікаў», і многіх іншых аспектаў. Пра тое, што праект кодэкса выклікаў вялікі інтарэс у краіне, казала і **намеснік старшыні профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў Наталля КУЧЫНСКАЯ, якая вядзе законапраект у ніжняй палаце парламента**.

— Па тых пытаннях і прапановах, якія прыходзяць да нас у камісію, можна гаварыць, што Кодэкс аб культуры — гэта той дакумент, якога грамадства сапраўды чакае, — адзначыла дэпутат. — Чакаюць і творцы, і службовыя асобы, і спажыўцы культурных даброт. Таму што культура — неад'емная частка нашага жыцця і найвялікшае нацыянальнае багацце.

Дэпутаты прагаласавалі за прыняцце законапраекта ў першым чытанні, і цяпер дакумент будзе рыхтавацца да другога чытання.

Акрамя праекта Кодэкса аб культуры, дэпутаты ўчора разгледзелі яшчэ сем законапраектаў і прынялі да ведама Дэкрэт Прэзідэнта №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

**Дэпутат ад Гродзенска-Занёманскай выбарчай акругі Алена БЕРАСНЕВА** спытала намесніка міністра культуры, па якіх крытэрыях пасля прыняцця кодэкса аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны будуць трапляць у дзяржаўныя праграмы:

***— Праз месяц скончыцца тэрмін дзеяння праграмы «Замкі Беларусі». Магчыма, яна ўвойдзе ў склад праграмы «Культура Беларусі». Калі ўвойдзе, ці застанецца мэтавае фінансаванне? Мяне цікавіць лёс Гродзенскага каралеўскага замка. Вы ведаеце, што ён знаходзіўся ў праграме «Замкі Беларусі», аблвыканкам выдаткаваў грошы на правядзенне праектных работ. Але, што будзе далей — ці дапаможа міністэрства правесці рэканструкцыю гэтага аб'екта? — канкрэтызавала пытанне парламентарый.***

*— У адпаведнасці з дзейным бюджэтным кодэксам, — адказала Ірына Дрыга, — фінансаванне з рэспубліканскага бюджэту мерапрыемстваў па захаванні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны можа выдзяляцца на тыя аб'екты, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, а таксама на капітальныя выдаткі аб'ектаў, якія знаходзяцца ва ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак ці катэгорыі «0», «1» і «2». Гэта агульны падыход. Сапраўды, прадугледжваецца пэўны перанос аб'ектаў з «Замкаў Беларусі» ў праграму «Культура Беларусі». Так што, у адпаведнасці з заканадаўствам і фінансавымі рэсурсамі, якія маюцца, рэстаўрацыйныя работы на аб'ектах камунальнай уласнасці таксама будуць падтрымлівацца. Пра лёс канкрэтных аб'ектаў можна будзе гаварыць, калі будзе зацверджана праграма «Культура Беларусі».*

## Фінансы

# МВФ адзначыў прагрэс краіны ў макраэканамічнай стабілізацыі

**Пра гэта паведаміў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ.**

Прадстаўнік Нацбанка адзначыў, што перамовы нашай краіны і Міжнароднага валютнага фонду аб прадастаўленні крэдыту могуць быць завершаны ў першым квартале 2016 года.

Ён пацвердзіў, што да гэтага часу павінна будзе прайсці планавае пасяджэнне савета МВФ. «Будзем мы на тым пасяджэнні ці не, залежыць ад таго, як зараз узгодзім узаемныя пазіцыі. Думаю, у першым квартале будзе зразумела: працуем мы з фондам далей, на якіх умовах, ці не працуем. Цяпер якраз ідзе працэс узгаднення», — дадаў Тарас Надольны.

Акрамя таго, ён адзначыў, што МВФ не ставіць якіх-небудзь жорсткіх патрабаванняў з нагоды ўмоў прыватызацыі прадпрыемстваў. «Ёсць некаторыя погляды на больш актыўны продаж некаторых сур'ёзных прадпрыемстваў, але не як комплекс мер», — растлумачыў першы намеснік старшыні.

### Налета сярэдні курс долара складзе 18,6 тысячы рублёў

Таксама Тарас Надольны паведаміў аб тым, што ў рэспубліканскі бюджэт Беларусі на 2016 год плануецца закласці сярэднегадавы курс долара на ўзроўні 18,6 тысячы рублёў. Чыноўнік Нацбанка пракаментаваў уключэнне Міжнародным валютным фондам кітайскага юаня ў кошык рэзервовых валют. «У нашым партфелі ёсць каштоўныя паперы, намінаваныя ў кітайскіх юанях. Уключэнне юаня ў рэзервы па міжнародных стандартах дасць нам магчымасць залічыць гэтую суму ў залатавалютныя рэзервы. Вядома, гэта невялікае ўкладанне. Мы спрабуем сябе на кітайскім рынку. У нацыянальным жа вызначэнні юані даўно ўжо трапляюць да нас у рэзервы», — растлумачыў пазіцыю рэгулятара першы намеснік старшыні Нацбанка.

### Насельніцтва выбера доўгатэрміновыя дэпазіты

Прадстаўнік Нацбанка ўпэўнены, што насельніцтву лепш размяшчаць беларускія рублі ў банках на дэпазітах з доўгімі тэрмінамі. На яго погляд, уклады ў нацыянальнай валюце трэба размяшчаць у банку мінімум на год. «Так неабходна рабіць хаця б толькі таму, што менавіта з гэтай даты захоўвання грошай на рахунку пачынае дзейнічаць ільгота па падаткаабкладанні ўкладаў. А калі больш, чым год, то гэта справа кожнага. Дэкрэт дае магчымасць выбару. У нас павінна быць і адказнасць грамадзяніна за свае рашэнні», — падкрэсліў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Да ведама

# РЭШТКІ ТАВАРАЎ БОЛЬШ НЕ «ПРАСКОЧАЦЬ»

**Індывідуальныя прадпрымальнікі з першых дзён студзеня будуць абавязаны гандляваць толькі па дакументах. Пра гэта ўчора падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення падаткаабкладання індывідуальных прадпрымальнікаў Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Наталля ПАДГОРНАЯ.**

Яна адзначыла, што прыняцце Указа №222 было накіравана як на стварэнне роўных умоў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, так і на прадухіленне ўвозу і распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі нелегальна выробленай і выпушчанай незаконна ў абарачэнне прадукцыі на тэрыторыі Мытнага саюза. Больш за тое — указам былі прадугледжаны пераходны перыяд для рэалізацыі рэшткаў тавараў без дакументаў працягласцю 18 месяцаў. «А вось з 1 студзеня 2016-га прадпрымальнікі абавязаны будуць гандляваць толькі па дакументах», — сказала спецыяліст.

Паводле слоў Наталлі Падгорнай, падаўжэнне канчатковага тэрміну рэалізацыі рэшткаў тавараў будзе азначаць захаванне няроўных канкурэнтных умоў для суб'ектаў гаспадарання, якія ажыццяўляюць імпарт і рэалізацыю тавараў у адпаведнасці з вызначанымі патрабаваннямі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Ідэі маладых

# КРЭАТЫЎ + ІНІЦЫЯТЫВА + БІЗНЕС

**60 бізнес-праектаў, распрацаваных студэнтамі 16 ВНУ, былі прадстаўлены ў Пінску на першым рэспубліканскім форуме маладзёжнага стартап-руху. Маштабнае мерапрыемства праходзіла на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, а яго арганізатарам і ініцыятарам выступіла Міністэрства адукацыі.**



Ацэньваў наватарскія ідэі экспертны савет, які ўзначаліў міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў. У савет увайшлі таксама старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін, намеснік дырэктара адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Аляксандр Марцінкевіч, прадстаўнікі бізнес-супольнасці, прадпрыемстваў і арганізацый. Прэзентацыя праектаў праходзіла ў фармаце краш-тэстаў, што дазваляла бізнесменам-пачаткоўцам вызначыць узровень перспектыўнасці сваёй прапановы, атрымаць рэкамендацыі па ўдасканаленні праекта, а магчыма, і грант на рэалізацыю сваёй ідэі.

У краіне зараз ідзе актыўная праца па прасоўванні студэнцкіх стартап-праектаў. Спецыяльныя мерапрыемствы па навучанні тых, хто хоча прадставіць сваю ідэю інвестарам (як трэба праводзіць прэзэнтацыю, як распрацаваць бізнес-план, дзе шукаць інвестараў), арганізуюць і самі ВНУ. Таму галоўнай задумай форуму было стварыць умовы для таго, каб маладосць, крэатыў, ініцыятыва і бізнес знайшлі адзін аднаго.

Міністэрства адукацыі выдзяліла гранты на рэалізацыю трох студэнцкіх стартап-праектаў. У намінацыі «Самы інавацыйны бізнес-праект» грант ад Мінадукацыі (і планшэт кіраўніку праекта) быў уручаны **камандзе Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта** за распрацоўку пад мудрагелістай назвай «Тэрмамеханічна мадыфікаваная драўніна для вырабу верхняга слою паркета». Студэнтам удалося палепшыць фізіка-механічныя ўласцівасці мяккалістаных парод за кошт ушчыльнення пад гарачым прэсам. Гэты спосаб дазваляе дадаткова абараніць паркет ад агрэсіўнага асяроддзя.

У намінацыі «Самы камерцыйна перспектыўны бізнес-праект» перамагла **каманда БНТУ** з інавацыйнай ідэяй «Студэнцкае бюро праектавання крэатыўнай упакоўкі». Маладыя людзі атрымалі грашовы грант на рэалізацыю ідэі, прыз ад Банка развіцця і медыяплэер.

Трэці грант быў уручаны **камандзе БДЭУ** за праект «Закон чысціні», прадстаўлены ў намінацыі «Самы крэатыўны падыход да вырашэння актуальнай праблемы». Размова ідзе пра вытворчасць тары для кавы, у састаў якой будзе ўносіцца насенне раслін. Такі карысны «посуд» за кошт прарошчвання насення і біясінтэзу раслін зможа штогод выводзіць каля адной тоны вуглякіслага газу з атмасферы. Экалагічны эфект відавочны.

У намінацыі «Найлепшая каманда праекта» ў секцыі «Бізнес-праект» (камерцыйны) перамагла **каманда Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій (ДІКСТ) БДУ.** Студэнты прадставілі праект «Веларыцар». Іх распрацоўка дапаможа знізіць колькасць крадзяжоў двухколавых машын за кошт выкарыстання спецыяльных велатрэкераў. У якасці ўзнагароды каманда атрымала сертыфікат ад Парка высокіх тэхналогій, які дае права на працягу паўгода навучацца ў гэтай арганізацыі.

А ў намінацыі «Народнае прызнанне» ў секцыі «Сацыяльны праект» найлепшым быў прызнаны праект «Нарачанская рэспубліка», прадстаўлены таксама **студэнтамі ДІКСТ БДУ.** Асноўная яго ідэя заключаецца ў наданні тэрыторыі Нарачы асаблівага статусу. «Нарачанская рэспубліка» будзе надзелена сваімі «правамі», «правіламі» і «канстытуцыяй», што дазволіць стварыць спецыфічны адметны каларыт гэтай мясцовасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## Ніколі не забудзем

# ВАЙНА — ТРАГЕДЫЯ ДЛЯ ЎСІХ

**Кніга, якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда», распавядае пра экспазіцыю, фонды і філіялы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны**

**Грунтоўным, сур'ёзным, велічным і ў той жа час надзвычай прыгожым — менавіта такім, як і сам музей, — падаецца выданне. Насычанае якаснымі фотаздымкамі экспазіцыі і цікавых экспанатаў, філіялаў музея, а таксама прадметаў з фондаў, якія немагчыма ўбачыць падчас экскурсіі, яно дазваляе больш поўна і глыбока асэнсаваць тэму Другой сусветнай вайны.**

Прычым не толькі нам, беларусам, якія найбольш пацярпелі ў гады ваеннага ліхалецця, а і нашчадкам нашых саюзнікаў і нават тым, хто ў той вайне змагаўся па іншы бок акопа. У найбуйнейшым сховішчы ваенных рэліквій Беларусі становіцца зразумела: ВАЙНА — гэта трагедыя для ўсіх, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці. Каб гэтая думка дайшла да як мага большай колькасці людзей, выданне падрыхтавана на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай.

На старонках — падзеі кароткага перадваеннага перыяду, гадоў самай крывавай вайны ў гісторыі чалавецтва і пасляваенных дзесяцігоддзяў. Тут можна знайсці хрэстаматыйныя эпізоды з ваеннай гісторыі, а таксама адшукаць і малавядомыя або ўвогуле невядомыя дагэтуль дэталі. Перад намі паўстаюць як ключавыя фігуры, героі той вайны, пра подзвіг якіх напісаны не адзін тэкст, так і асобы, пра якіх мы даведваемся ўпершыню.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

— Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — найбуйнейшае сховішча артэфактаў, сведчанняў і рэліквій самай жорсткай і крывавай вайны XX стагоддзя, — адзначае **рэдактар кнігі-альбома Наталля КАРАСЁВА.** — Гэта было адной з прычын, чаму Выдавецкі дом «Звязда» звярнуўся да кіраўніцтва музея з прапановай падрыхтаваць аб ім грунтоўнае выданне. У год святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі мы можам сцвярджаць, што спрычыніліся да вельмі важнай справы захавання і ўмацавання памяці аб подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Асобна — пра музейныя калекцыі. Некаторыя з іх не маюць аналагаў у свеце! Калекцыі рукапісных часопісаў і самаробнай партызанскай зброі — адны з найстарэйшых у музеі. Менавіта гэтымі экспазіцыямі 22 кастрычніка 1944 года ў адным з некранутых вайной будынкаў — Доме прафсаюзаў на плошчы Свабоды — адкрыўся музей.

А рашэнне аб стварэнні музея гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі было прынята яшчэ раней — 30 верасня 1943 года. Прычым экспазіцыю пачалі збіраць у адзін з самых цяжкіх перыядаў, калі краіна знаходзілася пад акупацыяй. Яшчэ было невядома, хто пераможа ў той вайне. Тым не менш савецкія людзі верылі, што праўда на іх баку. Амаль кожны прыносіў асабістыя рэчы, баявыя трафеі — музей, па сутнасці, ствараўся ўсім беларускім народам... Так Беларусь стала першай краінай у свеце, дзе адчыніў свае дзверы музей Другой сусветнай вайны.

...У сакавіку на старонках «Звязды» стартаваў сумесны праект рэдакцыі з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У рамках праекта «Шлях да Перамогі» мы распавядалі пра экспазіцыйныя залы музея, найбольш цікавыя экспанаты і гісторыі канкрэтных людзей, якія набліжалі Перамогу. Віртуальнае падарожжа па храме памяці яшчэ працягваецца. Спадзяёмся, што пасля нашых публікацый у вас з'явіцца (а можа, ужо з'явілася) жаданне ўбачыць усё на свае вочы. А гэта варта зрабіць кожнаму беларусу!

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

## Запрашальнік

# ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ — ПАД ЦЫМБАЛЫ І ГАРМОНІК

### Заслужаныя калектывы народнай музыкі з усёй краіны выступяць у філармоніі

**Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», які ўжо стаў сапраўднай візітоўкай Пастаўшчыны, адзначае 25-годдзе. Ёсць цудоўная нагода пачуць найлепшых выканаўцаў — лаўрэатаў фестывалю розных гадоў на святочным гала-канцэрце, які адбудзецца ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі 11 снежня.**

У святочнай імпрэзе, якую арганізуе Беларускі фонд культуры сумесна з Белдзяржфілармоніяй і пры падтрымцы Міністэрства культуры, возьмуць удзел вядомыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы з Беларусі. Сярод іх заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль народнай музыкі «Паазер'е» з Пастаў, заслужаныя калектывы «Палешукі» з Іванава Брэсцкай вобласці, ансамбль старадаўняй музыкі «Пастараль» з Дзяржынска, «Крупіцкія музыкі» з вёскі Крупіца Мінскага раёна і дзіцячы ансамбль «Дударыкі» з Мінска, а таксама капэла народных духавых інструментаў «Гуды» з Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў. Слухачоў парадуюць народны гурт вандроўных музыкаў «Фэст» з Баранавіч, ансамблі «Спадчына» з Дзяржынска і «Мінскія музыкі», вядомыя салісты-інструменталісты Барыс Харэвіч, Міхась Касцюкевіч, Васіль Шпілевіч і многія іншыя. Ну і, вядома, не абыдзецца святочны гала-канцэрт без ганаровага ўдзельніка фестывалю — Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.

Фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» — адзін з найстарэйшых і самых адметных у нашай краіне. У ім з задавальненнем бяруць удзел як артысты-аматары, кіраўнікі творчых калектываў, так і даследчыкі, навукоўцы. Фэст з года ў год славіцца сваёй душэўнасцю. Нарадзіўшыся на Віцебшчыне ў 1989 годзе, ён з 1992-га стала прапісаўся ў Паставах. Менавіта ў гэтым рэгіёне на той час захаваліся найбольш багатыя рэгіянальныя і лакальныя музычныя традыцыі Паазер'я. За час правядзення фестывалю ў яго мерапрыемствах прынялі ўдзел звыш 500 аматарскіх музычных калектываў і каля 460 індывідуальных выканаўцаў, у тым ліку з дзясяткаў краін блізкага і далёкага замежжа.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

## Падзея

# ГУЛЬНЯ Ў ІМЯ ПАМЯЦІ

### Міжнародны турнір па баскетболе стартуе сёння ў Мінску



**Штогадовыя спаборніцтвы памяці першага міністра спорту і турызму і кіраўніка Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Рыжанкова будуць працягвацца тры дні. Сёлетні турнір стане ўжо дзевятнаццатым па ліку і збярэ гасцей з пяці краін.**

Жаночая кадэцкая зборная Беларусі сустрэнецца з прадстаўніцамі Літвы, Расіі і Украіны. Сапернікамі мужчынскай кадэцкай каманды Беларусі стануць хлопцы з Малдовы, Украіны і Літвы.

Найлепшыя гульцы турніру атрымаюць прызы ад Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. Усе матчы пройдуць у спарткомплексе баскетбольнага клуба «Мінск-2006». У цырымоніі адкрыцця і закрыцця спаборніцтваў прыме ўдзел сын Уладзіміра Мікалаевіча Максім Рыжанкоў — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму, першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі і старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола.

Нагадаем, што дадзены турнір быў заснаваны ў 1996 годзе рашэннем урада Беларусі, каб увекавечыць памяць пра Уладзіміра Мікалаевіча Рыжанкова, які за сваё кароткае, але насычанае жыццё прыклаў шмат намаганняў для развіцця фізічнай культуры, спорту і алімпійскага руху ў краіне.

За заслугі перад Айчынай Уладзімір Мікалаевіч быў удастоены званняў «Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту», «Заслужаны трэнер БССР», узнагароджаны граматай Вярхоўнага Савета БССР, прызам і памятным медалём Міжнароднага алімпійскага камітэта.

**Расклад гульняў**
***4 снежня (пятніца):***
11.00 Украіна — Літва (дзяўчаты)
13.00 Украіна — Літва (юнакі)
15.00 Беларусь — Расія (дзяўчаты)
16.45 Урачыстае адкрыццё турніру
17.30 Беларусь — Малдова (юнакі)
***5 снежня (субота):***
11.00. Расія — Украіна (дзяўчаты)
13.00 Малдова — Украіна (юнакі)
15.00 Літва — Беларусь (дзяўчаты)
17.00 Літва — Беларусь (юнакі)
***6 снежаня (нядзеля):***
10.00 Расія — Літва (дзяўчаты).
11.00 Малдова — Літва (юнакі)
13.00 Беларусь — Украіна (дзяўчаты)
15.00 Беларусь — Украіна (юнакі)
16.45 Узнагароджанне. Закрыццё турніру.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## Гандбол

# СКА ДАВЕДАЎСЯ ІМЁНЫ САПЕРНІКАЎ

**У Вене адбылося лёсаванне групавой стадыі гандбольнага Кубка ЕГФ, у якім удзельнічаюць сталічныя армейцы.**

Хлопцы Спартака Міравовіча трапілі ў квартэт «С» разам з дацкім клубам «Б'ерынгбро», швейцарскім «Вінтэртурам» і французскім «Сэн-Рафаэлем». Першы тур адбудзецца 13-14 лютага.

Нагадаем, што ў групавую стадыю беларусы трапілі дзякуючы добрым вынікам у папярэдніх стадыях. У другім кваліфікацыйным раўндзе СКА перамог галандскі «Валендам», а ў трэцім прайшоў аўстрыйскі «Хард».

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Моцныя духам

# ТАКІ, ЯК І ЎСЕ

## Хлопец без рук вучыцца ў звычайнай школе і хоча стаць бухгалтарам

**Некалі цэлыя пакаленні зачытваліся «Аповесцю аб сапраўдным чалавеку». Гісторыя ваеннага лётчыка, які страціў ногі, але не страціў волі да жыцця і барацьбы, узрушвае і дагэтуль. Але і цяпер ёсць прыклады таго, як людзі з абмежаванымі магчымасцямі вядуць актыўнае, хоць і цалкам мірнае жыццё. Так, аўстраліец Нік Вуйчыч ад нараджэння не мае канечнасцяў. Аднак гэта не замінае яму ездзіць па ўсім свеце з лекцыямі. А таксама быць мужам і бацькам. І ў гэтым пераадоленні абставін таксама ёсць калі не гераізм, дык прынамсі немалая мужнасць. Нездарма Ніка Вуйчыча ведае ўвесь свет.**


На ўроку працоўнага навучання.

Саша Сідзельнік — жыхар вёскі Скрыгалаў Мазырскага раёна — чалавек сціплы. І на сусветную папулярнасць пакуль не прэтэндуе. І ўвогуле мала чым адрозніваецца ад іншых дзесяцікласнікаў. Зранку вучыцца, удзень наведвае трэнажорную залу, увечары робіць хатнія заданні і перапісваецца з сябрамі ў сацыяльных сетках. Звычайныя будні звычайнага падлетка. З адной толькі адрознасцю: у хлопца няма абедзвюх рук...

Рукі Аляксандр страціў праз няшчасны выпадак. Тады хлопцу было пяць гадоў. І калі надышла пара ісці ў школу, яго чакаў спецыялізаваны інтэрнат. Але бацькі дабіліся, каб сын атрымліваў адукацыю ў роднай вёсцы, і тагачасная адміністрацыя школы пайшла насустрач. Цяпер Саша вучыцца ўжо ў дзясятым класе разам з іншымі вясковымі дзецьмі. У маштабах нашай краіны — фенаменальны выпадак.

«Для нас, педагогаў, Шура — такі самы вучань, як і ўсе, — расказвае дырэктар Скрыгалаўскай сярэдняй школы Вячаслаў Фалінскі. — Яго хваляць за паспяховасць або выгаворваюць за памылкі нароўні з іншымі. І дзеці ставяцца да яго як да роўнага. За ўвесь час ніхто ніколі не дражніў і не крыўдзіў. Хоць ён і абараніць сябе можа. Нягледзячы на адсутнасць рук, хлопец вельмі развіты фізічна».

**Пратэз — гэта не болей чым кранштэйн, у які можна ўкласці ручку або крэйду. Па сутнасці, Аляксандр піша плячом. У розум не ўзяць, як гэта магчыма.**

Адметную ролю ў жыцці Аляксандра адыгралі настаўнікі пачатковай школы. Яны навучылі хлопчыка не толькі чытаць, але і пісаць. І калі гартаеш яго школьныя сшыткі, міжволі дзівішся акуратнаму почырку. Хоць Аляксандру афіцыйна дазволена не пісаць на ўроках, ён усё адно выконвае практыкаванні разам з класам. Як і ў маленстве, робіць гэта з дапамогай пратэза. Зрэшты, пратэз — гэта не болей чым кранштэйн, у які можна ўкласці ручку або крэйду. Па сутнасці, Аляксандр піша плячом. У розум не ўзяць, як гэта магчыма.

...У кабінеце дырэктара захоўваецца дошчачка з выпаленым на ёй малюнкам. «Па педагагічнай спецыяльнасці я настаўнік фізікі і працоўнага навучання, — расказвае Вячаслаў Фалінскі. — І калі Шура прыйшоў да мяне на ўрок разам з класам, я быў крыху збянтэжаны. Было відавочна, што хлопцу хочацца нечым займацца. Але што яму прапанаваць? Тады перамалявалі алоўкам гэты малюнак, замацавалі яму ў пратэзе прыбор для выпальвання на дрэве. І паглядзіце, як дыхтоўна выйшла! Не кожны чалавек гэтак зробіць нават рукамі!»

Аляксандр Сідзельнік дэманструе фенаменальныя навыкі не толькі на ўроках працы. Хлопец лоўка спраўляецца з камп'ютарнай мышкай пры дапамозе... носа і мышцаў твару. Сам дзесяцікласнік не бачыць у гэтым нічога адметнага. «Калі прыпячэ, то чалавек усяму навучыцца, — усміхаецца ён. — Я нават вышываў некалі, але пасля кінуў. А вось тэксты на клавіятуры набіраю штодня: раблю хатнія заданні, перапісваюся з сябрамі. Усё гэта раблю нагамі. Гэта толькі здаецца, што пальцы на нагах маларухомыя. Калі ўвесь час трэніравацца, яны хутка развіваюцца. Але карыстацца нагамі, натуральна, я магу толькі дома».

— У тым, што Шура паспяхова вучыцца, вялікая заслуга сям'і, — расказвае класны кіраўнік Аляксандр Савянок. — Дапамагаюць хлопчыку і сваякі, асабліва стрыечны брат. Яны аднагодкі, сябруюць з маленства, вучацца ў адным класе. Пры гэтым яшчэ і цёзкі. Таму Сашу Сідзельніка, у школе называюць Шурыкам, каб адрозніваць. А другі Саша заўсёды побач з братам: дапамагае дастаць і скласці кнігі, адгарнуць старонку і г.д.

Трэба адзначыць, што на долю сям'і Сідзельнікаў выпала нямала выпрабаванняў. Два гады таму пайшоў з жыцця Сашаў бацька. Каб забяспечыць сям'ю, мама ўладкавалася даяркай у тутэйшай гаспадарцы. Цяпер ужо загадвае фермай. Але, як кажуць педагогі, заўсёды знаходзіць час, каб завітаць у школу і пацікавіцца справамі сына. Цікавяцца гэтым і мясцовыя ўлады. У прыватнасці, аддзел адукацыі, спорту і турызму Мазырскага райвыканкама. Так, Аляксандр вучыцца па асобнай праграме, згодна з якой мае дадатковыя ўрокі матэматыкі, інфарматыкі і беларускай мовы. Гэтыя прадметы спатрэбяцца яму для далейшай вучобы.

Але атрымаць прафесію ў яго выпадку будзе няпроста. Тут ужо патрэбны не толькі спонсарская дапамога або адміністрацыйнае спрыянне. Праблема ў тым, каб знайсці навучальную ўстанову, што змагла б прыняць Аляксандра. Нягледзячы на развітую самастойнасць, пры ім павінен будзе знаходзіцца сацыяльны работнік. Бо вёска, дзе ўсе свае і ўсё сваё, — гэта адно. І зусім іншае — чужы незнаёмы горад. Ці можна будзе забяспечыць на новым месцы адпаведныя ўмовы для навучання і пражывання?

**Атрымаць прафесію ў яго выпадку будзе няпроста. Праблема ў тым, каб знайсці навучальную ўстанову, што змагла б прыняць Аляксандра.**

— Саму вучобу я адолею, — сцвярджае Аляксандр. — Маючы камп'ютар і інтэрнэт, можна нават займацца аддаленай працай. Якія планы на будучыню? Як і ва ўсіх: сям'я, дзеці... Але спярша трэба атрымаць прафесію. Кажуць, на Захадзе для людзей у маім становішчы распрацоўваюць спецыяльныя праграмы адаптацыі. Спадзяюся, што і ў нас будзе развівацца нешта падобнае. Бо я не збіраюся сядзець у дзяржавы на карку, хачу самастойна зарабляць сабе на хлеб. Пакуль што гэта і ёсць мая галоўная мара. І вельмі спадзяюся, што яна спраўдзіцца...»

**Валянцін БОЙКА.**
**Фота з архіва Скрыгалаўскай сярэдняй школы**


Саша паказвае на карце родную вёску.


ПРОДАЕМ
СЕТКА-РАБИЦА от производителя – 134 900 рублей;
ТЕПЛИЦА 3 410 000 рублей;
СТОЛБЫ 62 000 рублей;
ПРОФИЛЬНЫЕ ТРУБЫ, ВОРОТА, ПРОФЛИСТ, БЕСЕДКИ
БЫТОВКА МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 12 960 000 рублей;
АРМАТУРА, КАЛИТКИ, КРОВАТЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ, ПОСТЕЛЬНОЕ БЕЛЬЕ, ДВЕРЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 1 350 000 рублей
ДОСТАВКА БЕСПЛАТНАЯ! В течение 2–5 дней
Консультация по телефонам: +375 33 311 66 71, +375 29 947 19 44.
УНП 391802438


## НАПЕРАДЗЕ — «ЗЯЛЁНЫЯ» КІРМАШЫ

Лясгасы краіны гатовы прадаставіць для рэалізацыі амаль 269 тысяч навагодніх дрэў. Продаж гэтага галоўнага атрыбута зімовых свят пачнецца з 21 снежня як у сталіцы, так і ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах, пра што паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі. Плануецца, што лясгасамі разам з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам будзе арганізавана амаль 700 гандлёвых пунктаў па рэалізацыі навагодніх дрэў. Таксама кожны ахвотны пры жаданні зможа набыць елку непасрэдна ў лясніцтве. Цэны на лясных прыгажунь абяцаюць прымальныя: у сярэднім дрэва вышынёй да трох метраў будзе каштаваць 120 тысяч рублёў пры набыцці яго ў гандлёвым пункце і каля 90 тысяч, калі нехта захоча набыць яго ў лясніцтве.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# НА МОВЕ АРГО



## Калі брыдкаслоўе становіцца крыкам душы

ГЭТЫ дзед на мыліцах — сапраўдная візітоўка нашай невялікай па сталічных мерках вуліцы. Ён стаіць то з аднаго, то з другога боку па дарозе на прыпынак транспарту. Амаль штодня, у любое надвор'е, у любую пару года. Пад халодным восеньскім ветрам хутаецца ў свой кажушок, раз-пораз падскокваючы на адзінай назе, як замёрзлы верабей. Улетку выцягваецца на сваіх мыліцах, падстаўляючы твар сонцу, задаволена жмурыцца і нешта буркоча.

Шкада яго, вядома, але тып ён насамрэч вельмі непрыемны — ці не кожнага, хто ідзе міма, аблае, а калі паспрабуеш крыху суцішыць крок, — яшчэ і пашле самі ведаеце куды. Здаецца, толькі дзеля гэтага ён на вуліцу і выбіраецца, бо міласціну не просіць, а вось выказаць прэтэнзіі, якія ў яго назапасіліся да двухногай часткі чалавецтва, — гэта заўжды калі ласка.

Я, калі бачу на гарызонце знаёмую постаць, уся неяк унутрана натапырваюся і стараюся хуценька прабегчы міма, каб не трапіць з'едліваму дзеду на язык. Большасць суседзяў па вуліцы, у чым пераканалася за некалькі гадоў, якія ён у нас «дзяжурыць», робяць тое самае. І хто нас за гэта асудзіць?

ВОСЬ і гэтым разам — іду, насцярожана ўзіраюся ў ранішнія прыцемкі. Стаіць (прынесла ж яго ў такую непагадзь!), нервова ляпае па кішэнях. Ну, думаю, папала, сапсаваны на паўдня настрой гарантаваны. Пашанцавала той невысокай жанчынцы, што паперадзе ідзе: яна праскочыць без праблем, бо наш «добразычлівец» ужо ў мой бок развярнуўся і нават цыгарэту недакураную выплюнуў — каб красамоўней мне ўдачы і добрага шляху пажадаць.

І раптам тая жанчынка спынілася ля дзеда, спакойна да яго падышла, нешта сказала. Пасля — я вачам сваім не паверыла — ласкава ўзяла яго за руку, абняла, паклаўшы яго галаву сабе на плячо, пагладзіла па спіне, бы супакойваючы малое дзіця. Гледзячы ў вочы, сказала яшчэ колькі слоў, прыветна ўзмахнула рукой і заспяшалася на прыпынак. А злосны дзед стаяў збянтэжаны, расчулены, дрыжачымі рукамі спрабуючы дастаць з пачка новую цыгарэту і выціраючы слёзы, што проста ліліся з яго вачэй.

Зрэшты, стаяць і дзівіцца на гэткую метамарфозу не было калі. Мне проста неабходна было дагнаць тую жанчыну, якую бачыла толькі са спіны. Трэба было зазірнуць ёй у твар, пераканацца, што яна не ціхая гарадская вар'ятка, не «блажэнная» (бо хто ж нармальны так бы змог?)...

Дагнала, пераканалася. Дзесьці мая равесніца. Дагледжаны твар з добрым макіяжам. Сур'ёзны, крыху заклапочаны. У вачах — нават ні намёку на вар'яцінку... «Выбачайце, а што вы таму чалавеку на мыліцах сказалі?» — адважылася ўсё ж спытаць, калі за намі бразнулі дзверы тралейбуса. «А, гэтаму старому? Нічога такога. Ён проста некалькі разоў на мяне столькі брыдкаслоўя выплюхнуў. Я першы раз нават заплакала. А пасля падумала: а з ім хто-небудзь спрабаваў проста пагаварыць па-чалавечы? Не сварачыся, не з найгранай шкадобай, а проста як са звычайным чалавекам, у якога душа збалела. Яму, можа, за дзень і пагаварыць няма з кім, ніхто і слова (не тое што добрага — зусім ніякага) яму не скажа. Вось я і паспрабавала. Але ці ж адзін ён такі?..»

ЗДАЕЦЦА, гэтая дзівачка (а ў вачах большасці яна ўсё роўна будзе дзівачкай) сваімі простымі словамі патлумачыла адну вельмі надзённую праблему. Вы заўважылі, колькі апошнім часам стала брыдкаслоўя на вуліцах, у грамадскіх месцах? Лаюцца ўсе — свінарка і пастух, студэнты і інтэлігенты, лэдзі і джэнтльмены. У раёне нашага Дома прэсы, дзе некалькі буйных ВНУ, над натоўпам разумных, маладых, прыгожых людзей, якія ідуць з заняткаў, проста лунае рэха суцэльнага мату. У аддзеле жаночага адзення ў буйным магазіне гламурная паненка, прымераўшы дарагую сукенку, пытаецца ў сяброўкі: «Ну як?», і тая, не маргнуўшы вокам, гучна выдае «найвышэйшую ступень захаплення» з такой лексікай, што на яе азіраецца палова крамы. І падобных прыкладаў — па два на метр квадратны.

Гаварыць пра тое, што цяпер такая мода, ці ківаць на недахоп адукаванасці тут неяк не выпадае. Хутчэй прычына ў іншым. Брыдкасловіць сёння трэба, каб быць пачутым і заўважаным. І сваёй суполкай, і навакольнымі. Бо інакш так і будуць сядзець, уткнуўшыся носам у гаджэты, і нікому не будзе да цябе ніякай справы. Ні на вучобе, ні дома, ні ў транспарце. А вось загнеш «трохпавярховым», а яшчэ калі з «падвыпадвертам» — некалькі пар вачэй абавязкова на табе спыніцца. І будзе ілюзія, хоць на некалькі імгненняў, што камусьці не ўсё роўна, што камусьці да цябе ёсць справа. Нам усім — і няшчаснаму інваліду без нагі, і паспяховаму бізнесмену — гэтае веданне (ці ілюзія) вельмі патрэбнае. Проста як пацверджанне нашага існавання на гэтай зямлі...

А ДЗЕД наш не прапаў нікуды. Гэтаксама стаіць на ўсіх вятрах, натхнёна аблайвае ўсіх, хто ідзе міма. Людзі гэтаксама стараюцца абыходзіць яго бокам. А я яго ўжо не баюся — іду прама, хаду не прыспешваю. Спакойна слухаю мімаходзь, што ён пра мяне думае. Бо ведаю: варта спыніцца, прыветліва загаварыць пра надвор'е, пра тое, што хутка свята, што яму не варта тут доўга стаяць, бо прастыне, — і ад яго злосці і з'едлівасці і следу не застанецца.

Я абавязкова так зраблю. Заўтра. Або паслязаўтра. Калі-небудзь, калі будзе час. Але ж гэтыя тралейбусы — цэлая бяда: кожную хвіліну на іх можаш спазніцца...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Наталля МАРЫНАВА:

# «Я НЕ ЧАКАЮ, ШТО БУДЗЕ ЛЁГКА»

**Тэлеканал «Беларусь 2» мае сваю нішу, арыентуючыся пераважна на маладзёжную аўдыторыю. Не менш важна і тое, што амаль усе праекты тут ствараюцца маладымі і крэатыўнымі людзьмі. «Пін-код», «Рэпарцёр», «Зразумець і абясшкодзіць», рэаліці-шоу «Панаехалі» — выбар шырокі для любога тэлевізійнага гурмана. А нядаўна адбылося прыемнае — у тэлеканала з'явілася свая студыя. Мы сустрэліся з дырэктарам «Беларусь 2» Наталляй МАРЫНАВАЙ, каб даведацца, як гэта паўплывае на лёс праграм тэлеканала.**



***— Наталля Васільеўна, напрыканцы лістапада ў вас адбылося наваселле — свая студыя. Якіх перамен варта чакаць, улічваючы, што магчымасцей стала больш?***

— З'яўленне студыі — гэта адзін з этапаў развіцця тэлеканала «Беларусь 2». На пачатку новага сезона мы змянілі графічнае афармленне, студыя — проста наступны крок. Але сама па сабе яна — гэта проста сцены. Без таленавітай творчай групы, якая зможа там працаваць, не будзе ніякага выніку. Рыхтуючыся да новага сезона і ствараючы знешнюю карцінку, мы працавалі і над складам творчых груп. У штаце тэлеканала з'явіліся таленавітыя маладыя людзі з Акадэміі мастацтваў.

Напрыклад, адна з задач новага праекта «Пін-код» накіравана на заахвочванне маладых рэжысёраў, рэдактараў, журналістаў. Студыя — гэта пляцоўка для рэалізацыі задуманага. Мы можам назіраць, як ужо выходзяць адтуль праекты «Тэлераніца» і «Рэпарцёр». Тое, што цяпер маем сваю тэрыторыю, — вялікі плюс з эканамічнага і творчага пунктаў гледжання. Многія тэлеканалы ва ўсім свеце ідуць шляхам найменшых укладаў у студыйнае афармленне. І мы, як тэлеканал, арыентаваны на маладзёжную аўдыторыю, стараліся рабіць лёгкую студыю, якая дазваляла б стварадь не толькі агульную стылістыку, але і распрацоўваць «індывідуальнасць» для кожнай праграмы. Хаця мяркую, што для тэлегледача сёння больш важны творчы складнік таго ці іншага праекта.

**Тэлебачанне — гэта такі ж бізнес, як і любы іншы. Ёсць пэўная сацыяльная задача, якую мы выконваем. Але нельга не ўлічваць правілы рынку, дзе мы павінны зарабляць, каб існаваць.**

Вядома, мы не будзем працаваць толькі ў гэтым здымачным павільёне. Бо існуе шэраг ідэй, якія будуць рэалізоўвацца, як кажуць, на натуры.

***— Што самае складанае, калі кіруеш калектывам крэатыўных маладых людзей?***

— Мне здаецца, калі ў калектыве ўсё гладка і ўсё з усім пагаджаюцца — гэта альбо хлусня, альбо камандзе проста не цікава, што адбываецца. Людзі творчыя ў любым выпадку асобы з амбіцыямі. І я, шчыра скажу, не хачу бачыць на «Беларусь 2» абыякавых супрацоўнікаў. Таму мне заўсёды прыемна назіраць, як любыя ідэі, незалежна ад таго, хто іх прапаноўвае, у нас актыўна абмяркоўваюцца. Я заўсёды кажу: «Зараз мы сабраліся тут, каб выслухаць адно аднаго, паспрачацца, але прыняць рашэнне, з якім будзе згодны кожны».

Толькі такім чынам творчы патэнцыял можна сабраць і рэалізаваць любую ідэю на экране. Тэлебачанне — працаёмкі працэс, дзе задзейнічаны розныя структуры Белтэлерадыёкампаніі. І калі творчыя спрэчкі будуць адбывацца непасрэдна на здымачнай пляцоўцы, то працэс вытворчасці будзе няправільным. Улічваючы спецыфіку нашай працы, я не чакаю, што будзе проста. І больш за тое, не хацела б такога.

***— На «Беларусь 2» ёсць праект «Хачу ў тэлевізар», які з'яўляецца шанцам паказаць сябе для тых, хто марыць працаваць на тэлебачанні. Які чалавек можа прэтэндаваць на месца ў камандзе вашага тэлеканала?***

— У нас працягвае выходзіць 5-хвілінны фармат праекта «Хачу ў тэлевізар». Мы маем прыклады канкрэтных людзей, якім ён дапамог паказаць сябе. Адтуль нашы вядучыя браты Насыравы, пераможца першага рэаліці-шоу Герман Малышчыцкі (зараз працуе ў штаце асістэнтам рэжысёра). У той жа праграме «Пін-код» з'явіліся новыя твары, хаця запускалі праект мы з ужо вядомымі вядучымі. І ў якасці карэспандэнтаў з намі супрацоўнічаюць маладыя людзі з «Хачу ў тэлевізар».

Мы не проста так робім усе тыя 5-хвілінныя ролікі, а адсочваем цікавых прэтэндэнтаў. Таксама хачу супакоіць тых, хто пакуль не трапіў на праграмы ў якасці вядучых. Мы плануем рабіць другі сезон рэаліці-шоу «Хачу ў тэлевізар». Таму ў вас яшчэ будзе шанц прайсці навучанне прафесіі ў нашай тэлевізійнай студыі, а пераможца гарантавана атрымае прапанову працаваць у штаце «Беларусь 2».

Што тычыцца характарыстыкі вядучага, якога хацелася б бачыць на экране, то тут, напэўна, галоўнае ўлічваць погляды аўдыторыі, на якую мы разлічваем. Людзі часта жадаюць бачыць саміх сябе на экране. Калі мы гаворым пра моладзь, то ёй важна бачыць у кампаніі тых, хто, як і большасць маладых людзей, вучыцца, вырашае нейкія жыццёвыя пытанні, шукае свой шлях. Мы хочам быць сумленнымі ў адносінах са сваёй аўдыторыяй.

***— На ваш погляд, тэлебачанне многіх маладых прывабляе магчымасцю адчуць уласную папулярнасць?***

— Першапрычына такога выбару ў тых, хто адбыўся ў нейкай іншай прафесіі і прыйшоў сюды, — у наяўнасці здаровых амбіцый. Для многіх тэлебачанне нібы гісторыя пра Папялушку, і яны прыходзяць, разлічваючы, што нават нядоўгае з'яўленне на экране зменіць іх жыццё да лепшага.

Аднак тут, як і ў любым іншым месцы, трэба працаваць. І займацца тэлевізійнай дзейнасцю людзі пачынаюць, прайшоўшы пэўную прафесійную падрыхтоўку. Хаця бываюць і выключэнні, калі таленты прыходзяць «з вуліцы» і знаходзяць тут сваё месца. Але такія выпадкі адзінкавыя. А вось жаданне быць папулярнымі — рэч распаўсюджаная. Аднак не кожны гатовы траціць на дасягненне мэтаў шмат часу. А без гэтага на тэлебачанні не дамагчыся поспеху ў прафесіі.

***— Восенню на вашым тэлеканале стартавала рэаліці-шоу «Панаехалі». Ці лічыце праект удалым і калі варта чакаць працягу?***

— Няхай гэта нясціпла, але праект «Панаехалі» з'яўляецца ўдалай спробай стварэння рэаліці-шоу беларускімі вытворцамі. Хоць у нас і былі страхі перад запускам, як прыме гэтую гісторыю наш глядач. А цяпер аўдыторыя чакае працягу. І доля праглядаў у «Панаехалі» высокая. Праграма знайшла сваё месца ў сетцы вяшчання. 5 снежня мы ўжо даведаемся імя пераможцы, якога выберуць тэлегледачы з трох фіналістаў. У нас многія пытаюцца, дзе мы знайшлі такіх герояў. Яны ў нас рэальныя! І гэтыя маладыя людзі шчырыя ў тым, як успрымаюць сучаснае жыццё. Мабыць, у гэтым і хаваецца сакрэт поспеху рэаліці-шоу. Самі героі адзначаюць, што яны змяніліся за час удзелу ў праекце.

Таму і працягу яго варта чакаць. Праўда, мы да апошняга моманту не раскрыем месца, дзе апынуцца ўдзельнікі новага сезона. Здымкі, думаю, творчая група пачне ўжо вясной, каб у наступным сезоне мы зноў былі ў эфіры. Кастынг правядзём на пачатку 2016 года.

***— У сетцы вяшчання ў вас прысутнічаюць таксама расійскія серыялы, папулярныя праекты кшталту «Бітва экстрасэнсаў». Якім чынам іх выбіраеце?***

Старшыня журы — рэжысёр і сцэнарыст Святлана Праскурына — была абурана і эмацыйна звярнулася да аўтараў прадстаўленых карцін: «Каб зжэрці ў гледача дзве гадзіны часу, вы павінны дзесяць разоў падумаць — вы пра што наогул з ім размаўляеце? Выходзіць чалавек і дзве гадзіны «канструляецца» (слова Праскурынай. — **Аўт.**) па экране. Але для паказу на фестывалі выбрана тое, што выбрана, і ў нейкім сэнсе гэта суцэльная праграма, якая паказвае, што з усімі намі адбываецца. Мы абжэрліся фальшывасцю і нават не разумеем, што ядзім толькі локшыну «Дашырак», што нам ужо падабаецца яе смак і колер. Нам здаецца, што гэта высокая кухня, але давайце зробім хоць што-небудзь і хоць сабе перастанем хлусіць».

Тым не менш, галоўным на фестывалі лічыцца конкурс «Выбаргскі рахунак», пераможцаў у якім вызначае глядацкае галасаванне, і менавіта тут першае месца заняла карціна Аляксея Пятрухіна. Так, «Вучылка» стала галоўным адкрыццём фестывалю, а сам фестываль стварыў прэцэдэнт у кінасферы Расіі.

«Вучылка» таксама распавядае пра прэцэдэнт, толькі тут месцам дзеяння з'яўляецца школа, а галоўным незадаволеным — настаўніца гісторыі, якая падчас урока ў адзінаццатым класе адбірае ў вучня пісталет, і ў школе пачуўся стрэл... Настаўніца бярэ клас у заложнікі і вымушае дзяцей адказваць на пытанні па гісторыі. Супрацьстаянне паміж класам і пажылой настаўніцай, за якім назіраюць дырэктар школы (Ганна Чурына), карэспандэнт (Аліса Грабеншчыкова) і палкоўнік паліцыі (Андрэй Мярзлікін), расцягваецца на дзве гадзіны.

Вучні прадстаўляюць сабой пэўныя тыпажы грамадства. Спачатку меркавалася, што ў класе будзе вучыцца пятнаццаць чалавек (столькі ж, колькі рэспублік было ў Савецкім Саюзе), але кастынг выявіў большую колькасць цікавых акцёраў, таму вучняў стала васямнаццаць.

Пасля выбаргскага кінафестывалю фільм быў узнагароджаны на іншых форумах: атрымаў Гран-пры на фестывалі акцёраў-рэжысёраў «Залаты Фенікс», прызы міжнароднага кінафестывалю «Усход & Захад. Класіка і авангард», галоўны прыз Фестывалю новага расійскага кіно «Абуджэнне».

Сваё меркаванне, ці заслужана журы выбаргскага кінафестывалю абышло «Вучылку», можна скласці, паглядзеўшы фільм у мінскім кінатэатры «Беларусь» да 9 снежня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■

## ПЯТНІЦА, 11 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00 Серыял «На край свету».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Былая жонка».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 23.35 Баявік «Залаты капкан».**
**17.35** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**18.10** Тайны следства.
**20.00, 21.55 Серыял «Ваенная разведка. Першы ўдар».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**23.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**10.00, 16.05 Трылер «Закрытая школа».**
**11.20 Серыял «Косці».**
**12.15** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.10 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**14.15 Серыял «Кухня».**
**15.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.40 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**18.40 Выбар гледачоў. Фантастыка «Людзі Ікс 2».**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.30** Рэпарцёр.
**1.15 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.40** «Сусветная карцінная галерэя».
**7.55, 12.25, 18.30, 23.30** «Калейдаскоп».
**8.10 «Таямніцы палацавых пераваротаў». Драма. «Падзенне Галіяфа».**
**9.30** «Андрэй Грамыка. Гігант, якому ўдалося выжыць». Дак. фільм.
**10.25 «Запіскі Піквікскага клуба». Драма.**
**10.55 «Папярэдняе даследаванне». Драма.**
**12.40 «Зулусы». Драма.**
**14.55** Б. Фрыл. «Translations». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
**17.15 «Вогненны стралок». Маст. фільм.**
**18.50 «Сын за бацьку». Драма.**
**20.10, 23.05** «Камертон». Народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Беларуская дыпламатыя. Першы міністр». Дак. фільм.
**21.30 «Гараж». Трагікамедыя.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35, 18.50, 23.45** Pro спорт. Навіны.
**7.50** Баскетбол. НБА. «Чыкага» — «Кліперз».
**9.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 6-ты тур.
**11.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Рапід» (Аўстрыя) — «Дынама-Мінск» (Беларусь).
**13.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Спрынт. Жанчыны.
**14.50** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Енісей» (Краснаярск).
**16.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Спрынт. Мужчыны.
**17.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**18.25** Піт-стоп.
**18.55** Фактар сілы.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Северсталь» — «Дынама-Мінск».
**21.40** Змяшаныя адзінаборствы. Fight Night.
**23.55** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.15** «Смак».
**14.05** «Вучыцца жыць».
**14.35** «Час пакажа».
**16.20 Маст. фільм «Шчыра Ваш...».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Мой бізнэс».
**22.20** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі».
**23.40** «Легенды Live». «Stevie Wonder».
**0.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Драма «Адзін дзень».**
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Эліксір маладосці».
**14.45** «Дарагая перадача».
**14.55** «Калі Аляска стане нашай?» Дакументальны спецпраект.
**16.50** «М і Ж».
**18.35** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Танцуй адсюль!».**
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**0.00** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**0.45 Трылер «Кашмар на вуліцы Вязаў 5: дзіця сноў».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Любімыя акцёры».
**9.30 Маст. фільм «Формула кахання».**
**11.10 Маст. фільм «Жанчына, не схільная да авантур».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Серыял «Развод».**
**15.05** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Бурштынавы барон».**
**19.25 Серыял «Няхай гавораць».**
**22.50 Маст. фільм «Мэры Попінс, да пабачэння».**
**1.25** «Трымайся, шоубіз!»
**1.55 Маст. фільм «Ты не адзінокі».**
**4.50** «Народы Расіі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.10** «Гісторыя нораваў. Людовік XV». «Гісторыя нораваў. Вялікая французская рэвалюцыя».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30** «Наш чалавек».
**18.20 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
**21.00 Серыял «Земскі доктар».**
**22.00, 23.10** Урачыстая цырымонія ўручэння Першай расійскай нацыянальнай музычнай прэміі.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Адвакат».**
**7.10** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Справа густу».
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20 Серыял «Ліцейны».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Маст. фільм «Выбух з мінулага».**
**23.10** «Большасць». Ток-шоу.
**0.10** «Справа цёмная».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Бездань».**
**9.35, 10.45, 13.50, 15.45, 18.25, 19.30, 21.00** «Хатняя крама».
**9.50** Дак. серыял «Дзікі свет».
**11.00 Драма «Дурная справа не хітрая».**
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Меладрама «Прынцэса спецый».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Пад купалам».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Хлоя».**
**22.50** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».

### ВТБ

**6.00, 7.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 8.00, 20.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 17.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Святлафор 5».
**10.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**11.00, 14.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**12.00** Камедыя «Халасцякі ў адрыве».
**15.00, 5.00** Серыял «Нефармат».
**16.00** «Турбаміксер».
**17.00, 4.00** «Лаві момант».
**17.30, 19.00, 23.30** «Уральскія пельмені».
**18.00, 1.00** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».
**21.10** Прыгоды «Грамабой».
**23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** Скетчком «Студэнты».
**2.00** «Імперыя ілюзій».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20, 15.10, 19.45, 23.45** Л.М. Талстой. «Вайна і мір». Чытаем раман. Прамая трансляцыя.
**12.55, 21.55** «Вайна і мір». Маст. фільм.
**14.30** «Паляванне на Льва».
**17.15** С. Пракоф'еў. Опера «Вайна і мір». Музычны тэатр ім. К.С. Станіслаўскага і У.І. Неміровіча-Данчанка. Дзеянне 2-е.
**19.00** «Містыка кахання». Леў Талстой і Соф'я Талстая».
**1.55** «Ясная Паляна. Леў Талстой». Дак. фільм.
**2.35** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Быў час...» з Аляксандрам Паліткоўскім. «Гульня ў хіпі». 2006 год.
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 12.55, 14.25, 15.40, 17.00, 19.10, 21.40, 23.00, 0.55, 2.25, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Уключыце паўночнае ззянне».
**8.45, 14.45, 20.45, 2.45** Кінача-сопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Таццяна Дрыгіна і Максім Якаўлеў. 2007 год.
**13.10** Маст. фільм «Вяртанне».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1990. 1-я частка. Р. Вікцюк.
**19.25** Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?».
**22.00** «Колба часу».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Дзмітрый Багданаў. 2008 год.
**1.20** Маст. фільм «У адно-адзінае жыццё».

### EUROSPORT

**5.00, 10.00, 23.30** WATTS! Спецыяльны снежаньскі выпуск.
**6.00** WATTS!
**6.30** Футбол. Лаціна.
**7.00** Футбол. ФІФА.
**7.25** Футбол. Чэмпіянат MLS. Фінал.
**7.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Фіналы.
**9.00** WATTS! Зімовыя віды спорту.
**10.30** Гарналыжны сезон.
**10.45. 18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**11.45, 16.15, 1.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**13.15, 0.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**15.00** Фрыстайл. Кубак свету.
**19.00, 3.30** Снукер. Еўратур. GIBRALTAR OPEN.
**0.00** TIMBERSPORTS. Чэмпіянат свету.
**1.55** «Спартыўныя прыгоды».
**2.00** Конны спорт. «Клуб коннікаў».
**2.15** Акадэмія GT. Аўтаспорт.
**2.30** Strongest man. Ліга чэмпіёнаў.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00** Серыял «Былыя».
**6.25** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
**8.00** Камедыя «Халасцячкі».
**10.35** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці».
**12.20** Камедыя «Мільён на Раство».
**14.00, 14.45, 15.30, 0.55, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**14.15, 15.00** «Камедыянты (шоу)».
**16.00** Камедыя «Кухня ў Парыжы».



**18.45** Камедыя «Няўдачлівыя».
**20.20** Меладрама «Домік у сэрцы».
**23.10** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**1.15** Камедыя «Усё ўключана 2».
**4.00** Камедыя «ALL INCLUSIVE, або Усё ўключана!».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.10** «Доктар І...»
**8.40, 18.55, 1.35** «Гісторыя кахання». Серыял.
**10.00, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.20** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.45** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.40, 17.55** «Чалавек-прынада». Серыял.
**14.35** «Простыя складанасці».
**15.05, 2.50** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Мой герой».
**16.50** «Двайное жыццё». Серыял.
**20.35** «Нянькі». Камедыя.
**22.25, 5.10** «Зорныя гісторыі».
**23.20** «Доказ віны».
**23.50** «Іншы свет 2». Фэнтэзі.

### ТБ1000

**6.00** Фэнтэзі «Гары Потэр і Ордэн Фенікса».
**8.30** Меладрама «Да цуду».
**10.30** Меладрама «Джэйн Эйр».
**12.40** Камедыя «Імоджэн».
**14.30, 4.00** Фантастыка «Стэлс».
**16.30** Меладрама «Справа ў табе».
**18.10** Фантастыка «Філосафы: урок выжывання».
**20.00** Камедыя «З 5 да 7. Час палюбоўнікаў».
**21.45** Трагікамедыя «Пакуль не накрыўся вечкам».
**23.30** Драма «Сцежкі».
**1.30** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Карасі».
**8.20** Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».
**10.10** Драма «Кромаў».
**12.15, 13.30** Драма «Царскае паляванне».
**14.45** Драма «Мужчынскі сезон: аксамітная рэвалюцыя».
**16.45** Баявік «Дзень Д».
**18.20** Драма «Дом ветру».
**20.20** Драма «Каляфутбола».
**22.10** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**0.10, 1.55** Драма «Нябесны суд. Працяг».
**3.55** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 3.45** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 13.45** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.35, 13.20** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Ледзяная дарога.
**8.45** Непакорлівы востраў.
**9.30, 14.10, 19.30** Золата Юкана.
**10.20, 14.50, 20.15** Незвычайныя здабычы.
**11.00** Гонка да Паўднёвага полюса.
**11.50** Шаша праз пекла.
**12.35** Сканеры старажытнага свету.
**15.40, 17.10** Навука будучыні.
**16.25** Дзікая прырода Расіі.
**18.00, 21.00, 0.45, 4.30** Прарыў.
**18.40** Даследчык 2.0.
**21.45, 1.30, 5.15** Пачатак чалавецтва.
**22.30** Сканеры старажытнага свету.
**23.15** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.
**0.00, 2.10** Расследаванні авіякатастроф.
**3.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Ідрыс Эльба: без тармазоў.
**8.50, 1.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Гаражнае золата.
**11.35, 7.10** Выжыць разам.
**13.25, 6.25** Атам.
**15.15, 5.35** Дарожныя каўбоі.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Смяротны ўлоў.
**20.00** Хлопцы з Юкана.
**22.00** Гонка на выміранне.
**0.00** Незвычайныя акулы.
**2.00, 4.50** Прапажы на продаж.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

■ А вы ведалі?

## Колькі веласіпедаў змяшчаюць каналы Амстэрдама?

**Ах, гэтыя кароткія факты-гісторыі: усяго за 5 хвілін можна хутка паразумнець або, прынамсі, правесці іх з карысцю!**

■ Японскі ваенны інжынер, які спраектаваў самалёты для камікадзэ часоў Другой сусветнай вайны



(гэтыя машыны былі прызначаны для нанясення бомбавых удараў з пікіравання), вельмі шкадаваў аб гэтай сваёй ролі ў вайне і вырашыў выкарыстоўваць такія навыкі з мірнымі мэтамі. Ён распрацаваў праект «Шынкансэн» (ці «Цягнік-куля») — сетку высакахуткаснай чыгункі, дзе да сённяшняга дня не было ніводнага інцыдэнту са смяротным зыходам.

■ Скандынаўскі мараплавец і першаадкрывальнік Эрык Руды знарок даў суровай Грэнландыі такую шматспадзеўную назву (нарвежскае слова «gronland» перакладаецца як «зялёная зямля»), каб прыцягнуць патэнцыйных перасяленцаў. Хітрасць спрацавала.

■ У 1999 годзе Google ледзь не прадалі за $750 тысяч, таму што заснавальнікам праекта не хапала часу на вучобу.

■ Адзін рабаўнік-віртуоз скраў брыльянтаў на 100 мільёнаў долараў, падабраўшы патрэбны код да замка са 100 мільёнаў камбінацый, абышоўшы інфрачырвоныя і сейсмічныя датчыкі і ахоўнікаў з прыватнай кампаніі. Злавілі і асудзілі яго па ДНК, якую ўзялі з пакінутага на месцы злачынства недаедзенага сэндвіча.

■ Кожны год з каналаў Амстэрдама здабываюць ад 12 да 15 тысяч веласіпедаў.



■ Калі б дыяметр нашай планеты быў на 50% большы, то мы б не змаглі запускаць у космас ракеты з прычыны вагі паліва, неабходнага для касмічных палётаў.

■ Выслоўе «брытва Хэнлана» апісвае тэндэнцыю падазраваць злачынны намер у тым, што на самай справе тлумачыцца звычайнай памылкай. Яно гучыць так: «Ніколі не прыпісвайце злому намеру тое, што можна поўнасцю растлумачыць глупствам».

■ Адзін чалавек прадаў усю сваю маёмасць (уключаючы вопратку), паехаў у Лас-Вегас, паставіў усе атрыманыя ў выніку грошы ($136 тысяч) на адну гульню ў рулетку з шанцам 50/50 і выйграў.

■ У час вайны ў В'етнаме амерыканскія салдаты прыстасаваліся патроху есці вядомую і вельмі небяспечную пластычную ўзрыўчатку C4, каб атрымаць наркатычнае ап'яненне.

■ У лобстараў мозг размешчаны ў горле, нервовая сістэма — у брушку, зубы — у страўніку, а ныркі — у галаве. Акрамя таго, лобстары чуюць нагамі, адчуваюць смак ежы клюшнямі і, як і людзі, бываюць праўшамі і ляўшамі.



# НЯДЗЕЛЯ, 13 СНЕЖНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**7.20 Меладрама «Вясковая гісторыя».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.20** «50 рэцэптаў першага».
**11.05** XXL WOMAN TV.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50 Меладрама «Каралі».**
**17.35 Меладрама «Я буду чакаць цябе заўсёды».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55 Камедыя «Тарыф Нагодні».**

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** М/с «Сябры анёлаў».
**8.00 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**10.00** «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.05, 23.20** Хачу ў тэлевізар!
**11.10, 17.20** Тэлебарометр.
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**14.00** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**15.00 Фантастыка «Людзі Ікс 2».**
**17.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. ЦСКА — «Цмокі-Мінск».
**19.50** Суперлото.
**20.40** Кіпень.
**21.10 Дэтэктыў «Метад Фрэйда 2».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.25 Меладрама «Іншаземка».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.55, 17.50, 0.35** «Калейдаскоп».
**8.15, 22.20 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.50 «Дырэктар». Драма.**
**12.10** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Таццяна Шубзда, Вольга Падчыненкава, Ігар Падчыненкаў.
**13.10, 18.05** «Размаўляем па-беларуску».
**13.15** «Наперад у мінулае».
**13.45** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**14.40** «Музеі Беларусі». Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. Магілёўскі гарадскі музей этнаграфіі імя Е.Р. Раманава.
**15.05 «Салярыс». Фантастыка.**
**18.10** «Гітара па крузе». Сямейны дуэт выканаўцаў аўтарскай песні Эдуарда Гіршова і Марыны Мельнікавай.
**19.10 «Не бядуй!» Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Юрый Антонаў. Мары збываюцца».
**23.50** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Мяцеж генерала Гордава». Дак. фільм.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.30, 23.25** PRO спорт. Навіны.
**7.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Гонка пераследу. Мужчыны.
**8.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Гонка пераследу. Жанчыны.
**9.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Норвіч» — «Эвертан».
**11.15** Баскетбол. НБА. «Бруклін» — «Кліперз».
**13.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Эстафета. Жанчыны.
**14.45** Плаванне. «Дуэль ў басейне». ЗША — Еўропа.
**16.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Эстафета. Мужчыны.
**18.00** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама-Мінск».
**20.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Вэст Бромвіч».
**22.10** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. ЦСКА — «Цмокі-Мінск».
**23.35** Баскетбол. НБА. «Фінікс» — «Мінесота».

## АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».



**10.40** «Фазэнда».
**11.15** «Брэйн-рынг».
**12.30** «Барахолка».
**13.20** «Госці па нядзелях».
**14.15** «Ералаш».
**14.35, 16.20 Меладрама «Калі любіш — даруй».**
**16.15** Навіны спорту.
**17.10** «Кропля ў кроплю».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Подых планеты».
**21.35** «Голас».
**23.35** «Што? Дзе? Калі?» Зімовая серыя гульняў.
**0.45 Толькі для дарослых. Трылер «Метад». Сеанс восьмы.**

## СТБ

**6.20 «Афрамасквіч 2». Серыял.**
**7.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.30, 16.50** «Аўтапанарама».
**7.55 Драма «Крывавы дыямент».**
**10.20** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 7». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.20 Маст. фільм «Паненка-сялянка».**
**15.40** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Дарагая перадача».
**17.50 Маст. фільм «Іронія кахання».**
**19.30** «Тыдзень».
**20.25** «Ваенная тайна».
**22.40** «Зорны рынг».
**23.40** «Адзінаццаць прычын канца свету». Дакументальны спецпраект.

## МІР

**6.00 Маст. фільм «Мэры Попінс, да пабачэння».**
**8.35** «Нітка да ніткі».
**9.05** «Ведаем рускую».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Тайны часу».
**11.05 Серыял «Няхай гавораць».**
**14.05, 3.20 Маст. фільм «Каралева».**
**16.15, 22.00 Серыял «Тульскі Токараў».**
**21.00** «Разам».
**22.40 Маст. фільм «Пакроўскія вароты».**
**1.15 Маст. фільм «Формула кахання».**
**2.50** «Любімыя акцёры».
**5.00** «Народы Расіі».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**7.30 Маст. фільм «Занадта прыгожая жонка».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.30** «Ранішняя пошта».
**13.10, 14.15 Маст. фільм «Памяць сэрца».**
**16.55** «Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка». Суперфінал.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Маст. фільм «Начная фіялка».**
**0.10** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая передача».
**11.00** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Паедзем, паядзім!»
**14.05** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**15.00, 16.20 Серыял «Час Волкава».**



**18.00** «Акцэнты тыдня».
**19.00** «Кропка».
**19.50 Серыял «Павуцінне».**
**23.25** «Прапаганда».
**0.00** «Ангола: вайна, якой не было». Дак. фільм.

## 8 КАНАЛ

**9.00, 14.00, 19.05, 23.30** «Надвор'е».
**9.05, 15.55** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 15.45, 16.15, 21.00** «Хатняя крама».
**10.45 Драма «Хросны бацька», 2 серыя.**
**14.05 Трылер «Сонная лагчына».**
**16.45 Серыял «Каломба».**
**18.05** «Хобі+TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.10 Трылер «Сярод белага дня».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Фантастыка «Гадзіла».**

## ВТБ

**6.00, 15.45, 23.50** Скетч-шоу «6 кадраў».
**6.30, 4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**7.00** «Хатняя кухня».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45, 15.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 15.00** Серыял «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Вялікая маленькая зорка».
**13.00** Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
**14.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.20** Серыял «Апошні з Магікян».
**17.20** Фэнтэзі «Паралельныя міры».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.30** Фэнтэзі «Дарыян Грэй».
**0.00** «Кіно ў дэталях».
**3.30** «Лаві момант».
**5.00** Серыял «Сваты».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Да пабачэння, хлопчыкі». Маст. фільм.
**11.55** «Легенды сусветнага кіно». Жорж Мельес.
**12.25** «Расія, любоў мая!» «Звычаі і традыцыі эрзі».
**12.50** «Арланы — каралі нябёсаў». Дак. фільм.
**13.45** «Што рабіць?»
**14.30** Фрэнк Сінатра. Канцэрт легендарнага спевака. Запіс 1969 года.
**15.30** «Пешшу...» Масква дзекабрысцкая.
**15.55** Да юбілею кінастудыі імя М. Горкага. «100 гадоў пасля дзяцінства».
**16.10** «Калі я стану велікáнам». Маст. фільм.
**17.35** Да 65-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Татарскага. «Астравы».
**18.15, 1.55** «Шукальнікі». Загадка «танцуючага» дыпламата.
**19.00** «85 гадоў з дня нараджэння Мікалая Рыбнікава. «Больш, чым каханне».
**19.40** «Сёмае неба». Маст. фільм.



**21.15** Да 110-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. «Васіль Гросман. Я зразумею, што я памёр». Дак. фільм.
**22.10** В. Гросман. «Жыццё і лёс». Спектакль Малога драматычнага тэатра — Тэатра Еўропы.
**1.25** «Пра ракаў». «З вечара дождж». М/ф для дарослых.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1990. Р. Віктюк.
**7.10, 8.30, 9.40, 11.00, 13.05, 14.40, 15.40, 17.30, 18.45, 19.55, 21.25, 23.00, 0.55, 2.25, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.25** Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?»
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**13.30** Дак. фільм «Ці будзе камунізм?»
**15.00** «Быў час». 2008 год.
**16.00** Маст. фільм «Кароткія сустрэчы».
**18.00** «Акулы пяра». Сяргей Мазаеў. 1997 год.
**19.30** Дак. фільм «Эцюд пра каханне».
**21.00** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар».
**22.00** Маст. фільм «Дзівак-чалавек».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Таццяна Дрыгіна і Максім Якаўлеў. 2007 год.
**1.10** Маст. фільм «Вяртанне».
**4.00** «Народжаны ў СССР».

## EUROSPORT

**5.00** Бокс.
**6.30, 9.30, 21.00, 2.00** Зімовыя віды спорту.
**7.30** WATTS!
**8.00, 22.00, 3.30** Снукер. Еўратур. GIBRALTAR OPEN.
**10.30, 16.30, 0.00, 3.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**11.15, 14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**12.30, 15.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**13.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**20.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**1.00** Конны спорт. ROLEX GRAND SLAM.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.50, 22.00, 3.00** Серыял «Былыя».
**6.25** Камедыя «Мільён на Раство».
**8.00** Камедыя «Няўдачлівыя».
**10.35** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**12.25** Меладрама «Домік у сэрцы».
**14.00** Камедыя «Дыска».
**16.00** Камедыя «Два светы».
**18.45** Камедыя «12 калядных жаданняў».
**20.20** Меладрама «Чужое вяселле».
**23.10** Камедыя «Пяць нявест».
**0.55, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**1.15** Камедыя «Кухня ў Парыжы».
**4.00** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.25** «Дачныя гісторыі».
**9.50** «Нераскрытыя тайны».
**10.45** «Паненка і кулінар».
**11.20, 1.05** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**14.45** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.10** «Дзяўчына сярэдніх гадоў». Меладрама.
**19.40, 5.20** «Без падману».
**20.35** «Тры дні на ўцёкі». Маст. фільм.
**23.00** «Асцярожна, махляры!»
**23.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.00** «Мужчына і Жанчына. Адчуйце розніцу». Дак. фільм.

## ТБ1000

**5.30** Прыгоды «Пітэр Пэн».
**7.30, 4.15** Драма «Танцуй са мной».
**11.40** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**13.40** Драма «Сцежкі».
**15.40** Меладрама «Эрын Бракавіч — прыгожая і рашучая».
**18.00** Драма «1+1».
**20.00** Драма «Лепшая прапанова».
**22.15** Драма «Рамэа і Джульета».
**0.20** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**2.20** Меладрама «Замуж на 2 дні».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20, 7.30** Драма «Царскае паляванне».
**8.45** Драма «Карасі».
**10.35** Драма «Мужчынскі сезон: аксамітная рэвалюцыя».
**12.35** М/ф « Вяртанне Бураціна».
**14.00** Казка «Пасля дожджычку ў чацвер».
**15.20** Меладрама «Адзінокі па кантракце».
**17.05** Меладрама «Домік у сэрцы».
**18.45** Камедыя «Жанчыны супраць мужчын».
**20.20** Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!»
**22.10** Драма «Каляфутбола».
**0.05** Меладрама «Яшчэ адзін год».
**2.00** Драма «Іуда».
**3.50, 5.00** Мюзікл «Саламяны капялюшык».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 13.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.35, 11.50** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**8.45** Сканеры старажытнага свету.
**9.30, 16.25** Навука будучыні.
**11.00** Місія.
**12.35, 21.00, 0.45, 4.30** Прарыў.
**14.10** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.50** Топ-10 мегамонстраў.
**15.40** Сіла племені.
**17.10** Расследаванні авіякатастроф.
**18.00** Пячора гіганцкіх крышталёў.
**18.40** Тайны гуансійскіх пячор.
**19.30** Замагільны свет Егіпта.
**20.15, 23.15, 3.00** Пачатак чалавецтва.
**21.45, 1.30, 5.15** Найгоршае надвор'е ў гісторыі?
**22.30, 2.15** Экстрэмальны лёд.
**0.00, 3.45** У пошуках Атлантыды.

## DISCOVERY

**8.00** Стальныя хлопцы.
**8.50, 4.50** Незвычайныя акулы.
**9.45** Гонка на выміранне.
**11.35** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**12.30, 21.00, 4.00** Голыя і напалоханыя.
**13.25** Дзікая кухня.
**14.20, 22.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.15, 23.00** Эфект Карбанара.
**16.10, 0.00** Трой.
**17.05, 1.00, 5.35** Мяцежны гараж.
**20.00** Драпежнікі буйным планам.
**2.00** Бітва за нерухомасць.
**3.00** Хуткія і гучныя.

■ Людзі і лёсы

# РазМЕЖАваныя сем'і

## Беларусам з вёскі Ракі, каб бачыцца са сваякамі, трэба прадаць... карову



Ад ускрайку вёскі да мяжы — рукой падаць.

**Гэтая літоўская вёсачка, што знаходзіцца за 200 метраў ад нашай мяжы, практычна не адрозніваецца ад беларускіх. Людзі тут гавораць пераважна на «трасянцы». Глядзяць па тэлевізары беларускія каналы. Размаўляюць са сваякамі, якія жывуць па той бок мяжы, па беларускіх сім-картках. «У нас тут 100 дамоў, але жыхароў значна меней. Вёска з кожным годам радзее. Большасці ўжо перавалілі за 70. Я ў свае 53 адзін з маладых», — усміхаецца Іван Саковіч і запрашае ў хату. На паліцах адразу кідаюцца ў вочы кнігі Быкава ды Караткевіча. Ля ног гаспадара, які жыве адзін, — кот. Марсіка дачка прывезла ў Ракі з Беларусі, каб татку было не так сумна. Іван Якубавіч з 2008 года мае літоўскае грамадзянства. Але лічыць сябе беларусам і, што ўсцешыла, распавёў сваю гісторыю на чысцюткай беларускай мове.**

### «І НЕ ПРЫЙДЗЕ БРАТ ДА БРАТА...»

— Вёска Ракі спрадвеку была беларускай. Некалі яшчэ мой прадзед купіў тут зямлю. А пасля дзесьці ў 40-50-х гадах яна і яшчэ чатыры беларускія вёскі адышлі да Літвы. Не магу сказаць, чыё гэта было рашэнне, можа, якія начальнікі на шашлыках падзялілі *(усміхаецца)*...

Раней было добра: жыхароў памежнай зоны прапускалі праз спрошчаны прапускны пункт па некалькі разоў на дзень. Дастаткова было паказаць пашпарт. У пачатку 2003 года ўвялі візавы рэжым... А далей — горш...

— Мая жонка ў той час працавала настаўніцай у беларускай школе. Да вёскі Дудкі Шчучынскага раёна ад нас рукой падаць — усяго 5 кіламетраў. Яна ездзіла туды штодзень на ровары. 15 красавіка 2003 года Света выехала на працу — і раптам вяртаецца. Кажа: пагранпераход закрыты. Я давай высвятляць, што здарылася. Аказалася, закрылі 23 спрошчаныя пункты па ўсім памежжы, сярод іх і наш. Усе былі ў роспачы. Бо ў нашай вёсцы няма такога дома, каб у Беларусі не было сваякоў ці магілак.

«І што цяпер... не прыйдзе брат да брата», — разводзілі рукамі ракаўцы.

**Але, дзякуй Богу, нас усё ж такі пачулі. З 2008 года пункт пагранпераходу пачаў працаваць на пастаяннай аснове, няхай толькі 3 дні на тыдзень...**

Старэйшыя браты Івана Якубавіча жывуць у Беларусі: адзін за пяць кіламетраў ад Ракаў, другі — за дзесяць. А як спрошчаны пункт закрылі, дык даводзілася ехаць да іх у аб'езд праз Гродна: 200 кіламетраў туды і столькі ж назад. Гэта, вядома, не толькі нязручна, але і дорага. Таму Іван Якубавіч і пачаў звяртацца да чыноўнікаў па абодва бакі мяжы з просьбай, каб вярнулі ім пункт пераходу.

— Калі пісаў лісты ад свайго імя, то на іх нават не адказвалі. Тады я вырашыў арганізаваць суполку беларусаў Літвы «Надзея». Людзі мяне падтрымалі. Беларускі бок спісваў усё на літоўцаў, літоўскія чыноўнікі адказвалі, што гэта беларусы ўпарцяцца, маўляў, мы хоць сёння адкрыем. Так і ківалі адзін на аднаго пяць гадоў. Але, дзякуй Богу, нас усё ж такі пачулі. З 2008 года пункт пагранпераходу пачаў працаваць на пастаяннай аснове. І хоць толькі 3 дні на тыдзень, але гэта вялікае шчасце, што мы можам ехаць да сваіх родзічаў наспрасткі.


У Марсіка, які жыве з Іванам Саковічам, таксама беларускія карані.

### «ЖОНКА НЕ ВЫТРЫМАЛА І ПАЕХАЛА ШУКАЦЬ ШЧАСЦЕ НА РАДЗІМУ»

— Святлана крыху не дачакалася адкрыцця пагранпераходу... Паехала шукаць шчасця ў Шчучынскім раёне. Пасля разводу сын застаўся са мной, а дачка з'ехала з мамай у Васілішкі.

***— Вы хочаце сказаць, што жонка вас пакінула праз праблемы з пераходам, бо хацела часцей бачыцца з роднымі?***

— У тым ліку і гэта. Тут працы ёй нармальнай не было. Яна настаўніца біялогіі, вывучыць жа літоўскую мову настолькі, каб можна было вучыць дзяцей, не так проста. Жонка не змагла прыстасавацца да новага жыцця. Не ведаю, як ёй, а мне непрыемна. Але гэта яе рашэнне, не права.

***— У вас не было жадання кінуць усё і пераехаць у Беларусь услед за жонкай?***

— Яно і было. Я аграном па спецыяльнасці, мог бы знайсці працу і там, але... Тут дзедаўская зямля, дом, свая справа... Я фермер: займаюся пчоламі, вырошчваю жыта, грэчку, авёс і прадаю. Маю 19 гектараў зямлі, 9 з іх пад лесам. Я не мог проста так усё гэта кінуць. Трэба ж было падымаць дзяцей, дапамагаць... І цяпер падтрымліваю іх. Дзеці паступілі ў Беларускі эканамічны ўніверсітэт: сын цяпер на другім курсе, дачка — на першым.

***— Вы можаце падарожнічаць па еўрапейскіх краінах без візы. Дзе вы былі за гэты час, што бачылі?***

— Нідзе далёка не быў. 2 гады таму ў Турцыю з'ездзіў пагрэцца ў цёплым моры. Бываю ў Польшчы калі-нікалі па патрэбе.

***— Гаспадарка замінае?*** — узгадваю я адгаворкі сваіх бацькоў.

— Якраз гаспадарка мне не замінае. Яе амаль няма. Кот і пчолы. Усё ж такі я не настолькі шмат зарабляю. А першае, што трэба, — гэта падтрымаць дзяцей. Таму дазволіць сабе вялікую раскошу падарожнічаць не магу.

***— Напэўна, сумна тут аднаму?***

— Вядома, сумна. Аднаму заўсёды жыць дрэнна. Але як ёсць. Тым больш, мне скардзіцца няма чаго: дзецям з прычыны таго, што ў іх двайное беларуска-літоўскае грамадзянства, не патрэбна віза, дык яны мяне часта праведваюць.

### «КАЛІ СВЯТА Ў СУСЕДА-КАТАЛІКА, ТО Я НЕ ПАЙДУ СЕКЧЫ ДРОВЫ»

***— Ці лёгка атрымаць візу ў Беларусь жыхарам вашай вёскі?***

— Пакуль я важу, то лёгка *(смяецца)*. Аформіўся як індывідуальны прадпрымальнік і дапамагаю грамадзянам Літвы атрымаць беларускую візу. Тыя, у каго ў Беларусі пахаваны сваякі, маюць права на бясплатную. Раней на дагляд магілак давалі двухразовую візу на год, цяпер — дзве аднаразовыя. У астатніх выпадках даводзіцца плаціць. Аднаразовая віза каштуе 25 еўра. Шматразовая для літоўцаў з беларускімі каранямі — 60 еўра на 3 месяцы. На год і болей — 150 еўра. Як мне аднаму, дык яшчэ нічога. Сусед жа сабе візу зрабіў і жонцы — заплаціў 300 еўра. Гэта ж цэлая карова. Пра пенсіянераў наогул маўчу...

***— Іван Якубавіч, а вы б хацелі, каб увялі бязвізавы рэжым для ўсіх?***

— Вядома.

***— Але ж вы згубілі б свой бізнес?***

— Не настолькі ён тут вялікі, каб моцна яго шкадаваць. Былі гады, калі за тыдзень рабіў да 20 віз. Цяпер 2-3 вязу. Важу, каб не сядзець на месцы. Толькі што салярку апраўдвае той заробак.

***— Беларусы таксама карыстаюцца гэтым наноў адкрытым спрошчаным пунктам пагранпераходу?***

— А як жа! Тыя, хто жыве ў памежнай зоне. Яна сёння складае 5 кіламетраў. Добра было б, калі б яна пашырылася да 30. Гэта б разгрузіла міжнародныя пункты. Я ўздымаў пытанне не раз: калі чалавеку трэба ў суседнюю вёску, ён мае візу і не вязе ніякіх тавараў, навошта яму ехаць па крузе, стаяць у чэргах. Няхай бы прапускалі праз спрошчаныя пункты пагранпераходу, якія пустуюць. Зараз абмяркоўваецца ідэя стварэння малога памежнага руху ў гэтым рэгіёне. Але, ведаеце, калі будуць доўга думаць над гэтым пытаннем, то неўзабаве не будзе каму ехаць. Прыгранічныя вёскі выміраюць... У 2003 годзе, калі закрылі наш пункт пераходу, на першы сход прыйшло 120 чалавек. Патрэба была вельмі моцнай. Праз пяць гадоў, што давялося чакаць, большасць з тых людзей, нават калі б і хацела некуды паехаць, не змагла б, здароўе не дазваляла. Некаторыя з іх не дажылі да таго моманту...

**Усе былі ў роспачы. Бо ў нашай вёсцы няма такога дома, каб у Беларусі не было сваякоў ці могілак.**

Калісьці вёска Ракі была напоўнена дзіцячымі галасамі. Аб гэтым сведчыць нават тое, што тут была школа. Цяпер закінуты будынак мясцовыя вернікі прыстасавалі пад царкву і касцёл. Прычым, што цікава, усё гэта ў адным пакоі. З аднаго боку — праваслаўныя абразы, з другога — каталіцкія.

— Найбліжэйшая ад нас царква знаходзіцца за 9 кіламетраў, у беларускай вёсцы Першамайск. Да таго, як закрылі памежны пункт, усе праваслаўныя ездзілі туды. Цяпер да нас прыязджае бацюшка з Друскенікаў. Праўда, рэдка, толькі па вялікіх святах, бо 100 кіламетраў — гэта няблізкі свет. Ксёндз жыве значна бліжэй, таму прыязджае ў Ракі часцей. У нас у вёсцы, як і ў Беларусі, здаўна пануюць рэлігійная павага і талерантнасць. Напрыклад, калі свята ў майго суседа-каталіка выпадае на будны дзень, то я, барані Божа, не пайду секчы дровы. І наадварот.

Калі казаць пра адрозненні... У вёсках, дзе жывуць мае браты, і па сёння адзначаюць народнае свята — запаскі. Першы раз выганяюць кароў у поле ўсёй талакой. Кожны бярэ нешта з сабой. І ладзяць своеасаблівы банкет на полі. Калі каровы супакоюцца, людзі сядаюць, частуюць адно аднаго, абмяркоўваюць вясковыя пытанні. Я спрабаваў аднавіць гэтую традыцыю ў Раках, не атрымалася. У нас больш адчуваецца заходні ўплыў, усе сядзяць па сваіх «норах». Па той жа бок мяжы нейкая большая згуртаванасць. Хоць і тут беларусы, і там...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота аўтара.**
*Мінск — Вільнюс — Ракі — Мінск.*

**Паводле слоў міністра замежных спраў Літвы Лінаса ЛІНКЯВІЧУСА,** у перамовах аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж Еўрасаюзам і Беларуссю ёсць прагрэс. «Перагаворны працэс актывізаваўся пасля Вільнюскага саміту Усходняга партнёрства. У сакавіку было апошняе пасяджэнне, на якім абмяркоўвалася гэтае пытанне. Як хутка атрымаецца ратыфікаваць пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму, мне складана сказаць, паколькі ўсё залежыць ад беларускага боку».

**Аляксандр ГЕРАСІМЕНКА, прадстаўнік грамадскай кампаніі «У Беларусь і Еўропу — БЕЗ ВІЗЫ!»:** «Беларусь — адна з краін Усходняга партнёрства, у якой няма спрашчанага візавага рэжыму. І гэта пры тым, што ў нас самы нізкі ўзровень адмоў у выдачы віз у параўнанні з іншымі — 0,3%. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што беларусы — неверагодна законапаслухмяная нацыя вандроўнікаў. Таму яны, можна сказаць, заслужылі, як мінімум, зніжэння кошту консульскага ўзносу да 35 еўра». Па прагнозах Аляксандра Герасіменкі, пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму можа быць падпісана на саміце Усходняга партнёрства, які пройдзе ў 2018 годзе ў Эстоніі.

---

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

РАБІНА — дрэва з прыгожымі белымі кветкамі ўвесну і сакавітымі чырвонымі ягадамі ўвосень, у нашых продкаў стала сімвалам жаночай долі — спачатку нявесты, а потым маладой жанчыны.

◈ Лічылася, што дрэва стварыў Сатана і «апаганіў ягады арабіны, каб нанесці людзям шкоду, ад таго яны і зрабіліся горкімі». Але Бог убачыў, што лісце на рабіне нагадвае крыж, і забараніў чалавеку секчы гэтае дрэва.

◈ У той жа час чырвоны колер ягад звязаў рабіну ў народнай свядомасці з ахоўнай магіяй. Каб засцерагчы сваю гаспадарку і хату ад нячыстай сілы, з боку вуліцы руплівы гаспадар абавязкова саджаў некалькі рабінавых дрэў.

◈ Гронкі рабіны вешалі ў хляве, каб у каровы не знікала малако, у якасці надзейнага абярэга і ўпрыгажэння раскладвалі іх паміж шыбамі вокнаў на зіму.

◈ Крыж, выраблены з рабіны, ахоўваў чалавека ад ліхога вока і іншых непрыемнасцей.

◈ У шматлікіх рэгіёнах рабіну выкарыстоўвалі ў час першага выгану жывёлы ў поле. Пастух галінкай гэтага дрэва гнаў на поле кароў, якія яшчэ не цяліліся.

◈ Ахоўную ролю выконвала рабіна і ў вясельным абрадзе. Ёю ўпрыгожвалі хату, падворак, ягады клалі ў абутак жаніх і нявеста, імі ўпрыгожвалі розныя стравы на стале і, вядома ж, вясельны каравай.

◈ Рабіна несла ў сабе і негатыўную інфармацыю. У народзе лічылі, што гэтае дрэва — прытулак нячыстай сілы. Таму знахары, калі чыталі замовы, адсылалі хваробы, праклёны і сурокі менавіта на рабіну.

◈ У шматлікіх месцах існавала строгая забарона ламаць галіны рабіны, рваць кветкі, выкарыстоўваць яе на дровы. Па-першае, на рабіну адсылалі хваробы і праклёны, і той, хто ссячэ гэтае дрэва, возьме на сябе непрыемнасці. Па-другое, рабіну лічылі «помслівым» дрэвам, і той, хто прынясе яму шкоду, сам хутка памрэ.

◈ Нягледзячы на горкі смак, нашы продкі ведалі цудоўныя лекавыя ўласцівасці ягад рабіны і выкарыстоўвалі іх як у якасці лекаў, так і ў ежу, з іх выраблялі настоі, віно, квас, адвары, іх запякалі ў караваі, варылі варэнне і г.д. Ягады рабіны нарыхтоўвалі на зіму пасля першых прымаразкаў, якія «вымаражвалі» гаркату з ягад. Гронкі рабіны падвешвалі ў халодных месцах пад дахам хаты ці ў сенцах.

◈ Вялікая колькасць ягад на рабіне прадказвала сцюдзёную зіму. Прыкмячалі, што ў год, калі не паспяваюць ягады рабіны, «не бывае ні добрага лета, ні цёплай восені».

## Отдел принудительного исполнения Витебского района РЕАЛИЗУЕТ, ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ ТОРГОВ, ИМУЩЕСТВО принадлежащее ООО «Витблок», а именно:

**ЛОТ № 1**. «Пеногенератор Фомм-ПГМ», инвентарный №00000022 – стоимостью 11.316.000 рублей.
**ЛОТ № 2.** «Установка для пенобетона Фомм-Проф 1000», инвентарный № 00000021 – стоимостью 26.400.000 рублей.
**ЛОТ № 3.** «Установка для производства пенобетона Санни-025», инвентарный №00000033 – стоимостью 4.458.000 рублей.
**ЛОТ № 4.** «Ресивер», инвентарный №00000023 – стоимостью 2.304.000 рублей.
**ЛОТ № 5.** «Полуприцеп цистерна (цементовоз) ЦТА-15-701», год выпуска – 1993, инвентарный №00000014 – стоимостью 33.420.000 рублей. **Данное имущество находится по адресу: Витебский район, д. Старинцы, ул. Ленина, д. 5.**

**Торги по продаже данного имущества назначены на 17 декабря 2015 года в 10 часов утра, по адресу: ул. Комсомольская, 31, каб. 12.**

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:

1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.
2. Внести залог в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района г. Витебска: филиал №200 АСБ «Беларусбанк», код банка 150801635, р/с 3642903002661, УНП 300002505 **не позднее 16.12.2015 года.**

Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.

В соответствии с п. 3 ч. 17 Инструкции по исполнительному производству Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Интересующую информацию можно получить в отделе принудительного исполнения Витебского района: ул. Комсомольская, 31, каб. № 12, либо по тел.: 8 (0212) 36-32-15, 23-64-15.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1.** Моноблок для холодного стерильного розлива тихих жидкостей Berta TRIPLEMATIC TP-2.00.00011L, инв. №67, машина для термической усадки декоративных колпачков на укупоренные стеклянные бутылки, инв. №72, этикетировочная машина Progress s6t1540133-3e, инв. №63, оснастка к этикетировочной машине, инв. №68, конвеер, инв. №74, стоимостью 654 600 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 2.** Счетчик УСБ -5/9202, инв. №109, стоимостью 9 800 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 3.** Счетчик УСБ -5/9204, 2 шт., инв. №110, 111, стоимостью 19 600 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 4.** Электропарогенератор, инв. №61, стоимостью 57 100 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 5.** Комплект мембранных фильтров, инв. №64, стоимостью 36 700 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 6.** Теплообменник трубчатый ТГ-5-ВП(Г)2-4 4-0,9, инв. №70, стоимостью 59 800 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 7.** Фильтродержатель ФД НС-300, инв. №77, стоимостью 5 000 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 8.** Электромагнитный расходомер Magflo, 3 шт., инв. №107, 108, 113, стоимостью 34 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 9.** Установка компрессорная СБН/Ф-500, инв. №218, стоимостью 18 500 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 10.** Бетоносмеситель, инв. №185, стоимостью 1 000 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 11.** Емкость из нержавеющей стали для пищевых продуктов, инв. №27, стоимостью 4 600 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 12.** Емкость стальная эмалированная, инв. №44, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 13.** Емкость стальная эмалированная, инв. №45, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 14.** Емкость стальная эмалированная, инв. №46, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 15.** Емкость стальная эмалированная, инв. №47, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 16.** Емкость стальная эмалированная, инв. №48, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 17.** Емкость стальная эмалированная, инв. №48, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 18.** Емкость стальная эмалированная, инв. №50, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 19.** Емкость стальная эмалированная, инв. №51, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 20.** Емкость стальная эмалированная, инв. №52, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 21.** Емкость стальная эмалированная, инв. №53, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 22.** Емкость стальная эмалированная, инв. №54, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 23.** Емкость стальная эмалированная, инв. №55, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 24.** Емкость стальная эмалированная, инв. №56, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 25.** Емкость стальная эмалированная, инв. №57, стоимостью 38 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 26.** Контейнер 40 фут, инв. №124, стоимостью 18 600 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 27.** Контейнер 40 фут, инв. №125, стоимостью 18 600 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 28.** Контейнер 40 фут, инв. №126, стоимостью 18 600 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 29.** Модуль металлический, инв. №82, стоимостью 4 300 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 30.** Насос, инв. №21, стоимостью 1 700 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 31.** Насос СН4-50, инв. №22, стоимостью 1 700 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 32.** Насос CRN 0.55 kW, инв. №213, стоимостью 6 200 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 33.** Насос МН1 1602-1/Е13-400 50-2, инв. №24, стоимостью 5 000 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 34.** Тележка гидравлическая, инв. №158, стоимостью 2 100 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 35.** Тележка гидравлическая, инв. №159, стоимостью 2 100 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 36.** Нагреватель переносной дизельный arcotherm ec40, инв. №143, стоимостью 16 300 000 бел. рублей.<br>**ЛОТ № 37.** Выпрямитель для дуговой сварки ВД-306 М1УЗ, инв. №37, стоимостью 3 800 000 бел. рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «БрандкоВИН» (УНН 391296728) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Полоцкий р-н, г.п. Боровуха, ул. Армейская, 57 |
| **Наличие обременений** | Нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 22.12.2015 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10-1 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34.<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс 8(033)6879145,<br>начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. 80336878807 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505 **не позднее 11.00 21.12.2015.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гроднорайагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу:**

| Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с, д. Котра, ул. Молодежная, 2, в составе: | | |
|---|---|---|
| **Наименование** | **Инвентарный номер** | **Общая площадь** |
| Площадка на 50 автомашин (проезд) | **401/С-22130** | общ. пл. покрытия **7485 кв.м** |
| Открытая стоянка тракторов (проезд) | **401/С-22131** | общ. пл. покрытия **6919 кв.м** |
| Подъездные пути (проезд) | **401/С-22132** | общ. пл. покрытия **5319 кв.м** |
| СТО на 100 автомобилей | **401/С-11650** | **1682,9 кв.м** |
| Столярный цех | **401/С-11656** | **1006,8 кв.м** |
| Мастерские | **401/С-11654** | **991,2 кв.м** |
| Склад | **401/С-11651** | **636,7 кв.м** |
